

СПРАВА АБ ВАСЯМНАЦЦАЦІ.

11



ЖУРАВІНАВЫ РАЙ У АЛЬМАНАХ

13

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

21 ЛІСТАПАДА 2018 г. СЕРАДА № 224 (28840)

**ЛІЧБА ДНЯ**

**77 %**

*працоўных рэсурсаў Мінска занята сёння ў эканоміцы горада. На рынку працы склалася досыць спрыяльная сітуацыя, калі колькасць вакансій значна перавышае прапанову рабочай сілы. Банк даных прапануе попыт наймальнікаў прыкладна па 950 прафесіях і спецыяльнасцях. Сярэдні ўзровень аплаты па прапанаваных у Мінску вакансіях перавышае Br600. Найбольшая частка прапаноў (57,4 %) з заработнай платай ад Br400 да Br800, 26,2 % — менш за Br400, 15,4 % — ад Br800 да Br1500, 1 % — больш за Br1500. На аднаго беспрацоўнага ў горадзе сёння прыпадае каля 16 вакансій, найбольш запатрабаваныя рабочыя прафесіі, наймальнікі зацікаўлены ў кваліфікаваных работніках. Пераважны попыт на кадры сфарміравалі арганізацыі будаўніцтва, гандлю, прамысловасці, аховы здароўя і сацыяльных паслуг, адукацыі. Рэдка сустракаюцца вакансіі для вахцёраў, вартаўнікоў, гардэробшчыкаў.*

# «ВЫ ЎЖО ПЕРАМОЖЦЫ!»

**Учора юныя ўдзельнікі дзіцячага «Еўрабачання» пабылі ў Палацы Незалежнасці**



Фота БелТА.

**Дзяўчаты і хлопцы напелі некалькі музычных матываў у залах палаца і накіраваліся на экскурсію, пасля якой сустрэліся з кіраўніком дзяржавы Аляксандрам Лукашэнкам.**

СТАР. 2

Будпляцоўка

## Зялёнае святло для будучай лазні

Горадабудаўнічы пашпарт будзе распрацоўвацца з улікам магчымых аб'ектаў будаўніцтва



**Пра гэта гаворыцца ў новай рэдакцыі палажэння аб парадку падрыхтоўкі і выдачы дазвольнай дакументацыі на будаўніцтва аб'ектаў, зацверджанага пастановай Савета Міністраў ад 31 кастрычніка 2018 года № 785. Дадзены дакумент пракаментаваў <u>начальнік галоўнага ўпраўлення горадабудаўніцтва, праектнай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Арцём ЮШКЕВІЧ</u> на прэс-канферэнцыі ў БелТА.**

СТАР. 4

Педсавет

## ВУЧОБА МОЖА БЫЦЬ У РАДАСЦЬ...

**калі размаўляць з вучнем на адной мове**

**Уявіце сабе сітуацыю: вучань зрабіў у дыктоўцы 20 памылак... Але ён папрацаваў над сабой і падчас наступнай спробы дапусціў ужо толькі 10 памылак. У балах школьнік атрымае адну і тую ж адзнаку. Але ці можна лічыць такі падыход справядлівым? Зразумела, што вучнем была здзейснена гіганцкая праца, але яна ніяк не адбілася на яго адзнацы. Дык адкуль, скажыце, узяцца матывацыі? Нядаўні візіт у Акадэмію паслядыпломнай адукацыі васьмідзесяці педагогаў з розных рэгіёнаў Расіі амаль супаў з навіной пра тое, што вучням краснаярскіх школ больш не ставяць «двойкі» і «пяцёркі» (у Расіі па-ранейшаму дзейнічае пяцібальная сістэма. — Аўт.). Іх замянілі каментарыямі, якія настаўнікі пішуць да кожнай работы. Эксперымент ахапіў 15 школ. Дзеці кажуць, што пасля адмовы ад звыклай сістэмы адзнак яны больш ахвотна вучацца на сваіх памылках. Педагогі, у сваю чаргу, адзначаюць, што новы метад паказвае моцныя і слабыя бакі школьнікаў і дапамагае пазбавіцца ад падзелу на выдатнікаў і няўдачнікаў. Менавіта новыя падыходы да ацэньвання пазнавальнай дзейнасці вучняў і яе вынікаў і сталі тэмай сустрэчы ў Мінску. З беларускага боку ініцыятарам абмену вопытам выступіў Цэнтр прафесійнага развіцця і інавацыйнай адукацыі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, а з расійскага — «Садружнасць школ асобасна-арыентаванай адукацыі».**

СТАР. 5

КОРАТКА

- **Электрычка з месцамі для веласіпедаў пачала курсіраваць у Беларусі.**

- Галоўную ёлку Беларусі пачалі манціраваць 20 лістапада на Кастрычніцкай плошчы ў Мінску. Цікавінкай убору стане ілюмінацыя з выкарыстаннем піксельных тэхналогій.



Фота БелТА.

- **Захаванне тэмпературнага рэжыму на прадпрыемствах праверацЬ тэхнічныя інспектары Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.**

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

# «ВЫ ЎЖО ПЕРАМОЖЦЫ!»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнт звярнуўся да юных спевакоў: «Вы ўжо пераможцы. У вашым узросце трапіць на такі конкурс у ліку ўсяго толькі двух дзясяткаў! Можна сказаць, сусветны конкурс, таму што ўвесь свет прыкаваны да гэтага відовішча». Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусь вылучаецца сваёй сумленнасцю і справядлівасцю, таму тут пераможа толькі наймацнейшы. Дзеці пагадзіліся з Прэзідэнтам.

Падчас цёплай размовы дзяўчаты і хлопцы акапэльна спелі песню Light up, якая з'яўляецца сімвалам дзіцячага «Еўрабачання» гэтага года, як і слоган «Запальвай!». Удзельнікі конкурсу падарылі Аляксандру Лукашэнку празрысты шкляны мікрафон — аналаг галоўнага прыза дзіцячага песеннага конкурсу. Потым юныя спевакі сфатаграфаваліся з Прэзідэнтам на памяць.

Даніэль Ястрэмскі, які прадстаўляе Беларусь на конкурсе, падзяліўся з журналістамі сваімі ўражаннямі: «Настрой баявы. Пазнаёміўся ўжо з усімі рабятамі. Вучым адно аднаго розным мовам — ужо хутка паліглотамі станем». Удзельнік лічыць, што яму пашчасціла выцягнуць восьмы нумар на выступленні 25 лістапада. Даніэль упершыню трапіў у Палац Незалежнасці: «Вельмі прыгожа тут. Гэта важная падзея, адказна, што нас запрасілі сюды». Ён адчувае падтрымку ад беларусаў, якія пішуць у сацсетках, і чакае нашых гледачоў на «Мінск-Арэне».

Ганна Філіпчук, удзельніца з Расіі, расказала, што «Прэзідэнт пажадаў поспехаў, сказаў цёплыя словы, што падтрымлівае ўсіх». Дзяўчыну ўразіў і сам палац з рознымі пакоямі для перагавораў, абяцала, што падзеліцца фоткамі адсюль у сацсетках. Спадабаўся ёй і Мінск, Ганна гаворыць, што ў вольны час плануе паглядзець славутасці. «Усе ўдзельнікі вельмі добрыя, усе адно аднаго падтрымліваюць. У нас адносіны як у сяброў, не як у сапернікаў», — падкрэслівае дзяўчына. Ганна рыхтуецца да галоўнага дня адказна — шмат рэпеціруе, настройваецца, каб выйсці на сцэну без хвалявання. Нагадаем, што летась Расія стала пераможцам дзіцячага «Еўрабачання».

Данэлія Туляшова, салістка з Казахстана, з сабой мае абярэгі — бранзалецікі, якія дапамагаюць у цяжкую хвіліну сабрацца. І на выступленне возьме з сабою таемную брошку: «Яна азначае дабро і сапраўды мне дапамагае і дадае ўпэўненасці», — гаворыць дзяўчына. У палацы ёй таксама спадабалася: «Тут вельмі прыгожа, я быццам пабывала ў замку прынцэсы. Я ўпэўнена, што гэты дзень надаў мне яшчэ больш удачы, бо мне пажадаў поспехаў Прэзідэнт». Дарэчы, сёлета Казахстан упершыню ўдзельнічае ў дзіцячым «Еўрабачанні», таму місія ў Данэліі адказная. Але дзяўчына займаецца штодзень, каб быць упэўненай у сабе і не хвалявацца.

Фідан Хусейнава, удзельніца ад Азербайджана, расказала, што старанна рыхтавалася да конкурсу. «Увесь дзень ішоў на падрыхтоўку. Мая песня пра тое, што ў кожнага дзіцяці ёсць свая мара быць падобным на кагосьці. Напрыклад, нехта хоча быць падобным на маці, нехта — на тату, іншы — на нейкага вядомага чалавека. І нічога не павінна спыняць вас — усе дасягняце сваіх мэт». Сама Фідан жадае быць падобнай на Лару Фабіян, ёй ужо пашчасціла спець з гэтай артысткай два разы! Дзяўчына напела ў палацы, мабыць, найбольш вядомую яе песню Je t'aime.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# ЗРАБІЦЬ АГУЛЬНАЕ СВЯТА

**Больш як 300 дзяцей і дарослых з 20 краін свету сталі ўдзельнікамі цырымоніі адкрыцця міжнароднага дзіцячага конкурсу «Еўрабачанне-2018», які праходзіць у Мінску. Але гэта — толькі маленькая частка тых, хто далучыцца да вялікага творчага свята, заўважае старшыня Белтэлерадыёкампаніі Іван Эйсмант.**


Фота БелТА.

«Тысячы білетаў не прадаваліся, а былі раздадзеныя беларускім дзецям. Мы запрасілі ў госці таленавітых дзяцей з мастацкіх навучальных устаноў, былых удзельнікаў конкурсу «Еўрабачанне», стыпендыятаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі, прыедуць дэлегацыі з усіх рэгіёнаў Беларусі». Сваю галоўную задачу беларускія арганізатары бачаць у тым, каб музычнае шоу атрымалася не толькі відовішчным, але і запамінальным, атмасферным для ўсіх яго ўдзельнікаў і гледачоў. Упэўненасць у тым, што гэта безумоўна атрымаецца зрабіць, выказаў і прадзюсар конкурсаў «Еўрабачанне» Ён Ола Санд, які ўхваліў адказны падыход беларусаў, «доўгую і руплівую работу над стварэннем гэтага шоу» і прыгадаў, што Мінск ужо прымаў дзіцячае «Еўрабачанне» ў 2010 годзе і гэты вопыт безумоўна пайшоў на карысць Белтэлерадыёкампаніі як арганізатару ўсіх конкурсных мерапрыемстваў.

Сёння юныя выканаўцы выпрабоўваюць сцэну «Мінск-Арэны» і «прымералі» да яе касцюмы і рэквізіт, запісалі агульную песню для нядзельнага канцэрта, а таксама бліжэй пазнаёміліся з беларускай сталіцай — у прыватнасці, наведалі Палац Незалежнасці. У найбліжэйшыя дні, акрамя штодзённых рэпетыцый, прэс-канферэнцый і здымак, у еўравізійным графіку канкурсантаў — экскурсія ў Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, які падрыхтаваў для дзяцей спецыяльную інтэрактыўную праграму, не толькі забаўляльную, але і культурна-асветную, на англійскай мове.

Нагадаем, фінал дзіцячага «Еўрабачання-2018» пройдзе 25 лістапада, генеральны прагон — дакладна такі ж паўнавартасны канцэрт, толькі без галасавання гледачоў — адбудзецца 24 лістапада.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# ВАЖНЫЯ ЛЮДЗІ

## 75 працэнтаў персаналу ІІ Еўрапейскіх гульняў складуць валанцёры

**Пра гэта расказала начальнік упраўлення па рабоце з валанцёрамі фонду «Дырэкцыя ІІ Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Надзея АНІСАВЕЦ на пашыраным пасяджэнні міжведамаснага каардынацыйнага савета па развіцці валанцёрскага руху.**

У мультыспартыўнай падзеі, якую прыме ў наступным годзе Мінск, будуць браць удзел прадстаўнікі 50 краін свету, у спаборніцтвах па 15 відах спорту на старты выйдуць чатыры тысячы спартсменаў, а акрэдытаваных асоб на Гульнях будзе 18 тысяч. Здаецца, каб арганізаваць настолькі маштабнае мерапрыемства, спатрэбіцца незлічоная колькасць людзей, і асноўная іх частка — гэта валанцёры. Сёння ў складзе, які будзе абслугоўваць Гульні, усяго 3 % пастаяннага персаналу, 22 % падрадчыкаў, а ўсю астатнюю масу, гэта значыць 75 %, будуць складаць менавіта валанцёры. *«Мы іх ніколі не адлучаем ад арганізацыйнага камітэта»,* — адзначае Надзея Анісавец і дадае, што асноўная частка добраахвотнікаў — гэта, вядома, моладзь. *«Бо яны маюць час, якi можна выдаткаваць на мерапрыемства. Хоць прыходзяць да нас і людзі, якія ўжо працуюць, і, што радуе, пенсіянеры, асабліва тыя, хто пайшоў на заслужаны адпачынак не так даўно».*

Заяўкі на правa стаць валанцёрамі ІІ Еўрапейскіх гульняў падалі ўжо больш за 12 тысяч чалавек, гэта грамадзяне 52 краін, дарэчы, самы далёкі прэтэндэнт — жыхар Аргенціны. З замежнікаў больш за ўсё ахвотных сярод расіян — 2725 чалавек, на другім месцы ўкраінцы — 184 чалавекі, на трэцім жыхары Казахстана — 91.

Кожны патэнцыйны валанцёр праходзіць шлях ад рэгістрацыі на спецыяльным партале да атрымання акрэдытацыі. Паміж гэтымі пунктамі неабходна прайсці асабістую гутарку, тэст на веданне замежных моў і навучанне, якое складаецца з некалькіх блокаў. Надзея Анісавец адзначае, што навучанне для валанцёраў не будзе замінаць праграме ў навучальных установах, бо асноўная частка валанцёраў — гэта студэнты. Плануецца, што заняткі будуць праходзіць па выхадных і пачнуцца з наступнага месяца.

*«Асноўная матывацыя валанцёраў — гэта практыка замежнай мовы і набыццё прафесійных сувязяў, бо такія мерапрыемствы для маладых людзей — гэта выдатны шанц на практыцы паказаць свае здольнасці»,* — расказвае Надзея.

Важна, што мець дачыненне да такой маштабнай падзеі змогуць і непаўналетнія: валанцёрам можна стаць з 14 гадоў. Таксама адчуць сябе часткай каманды змогуць людзі з лёгкай ступенню інваліднасці.

Адзначым, што многія валанцёры, якія будуць працаваць на ІІ Еўрапейскіх гульнях, ужо паспрабавалі сябе на іншых маштабных спартыўных мерапрыемствах: у асноўным гэта тэставыя турніры, якія праходзілі ў Мінску, а таксама маладзёжны чэмпіянат Еўропы па баскетболе. Мабыць, самым сур'ёзным вопытам для многіх стаў цяперашні чэмпіянат свету па футболе ў Расіі, дзе працавалі 50 беларускіх валанцёраў.

Хоць валанцёрская праца і мае на ўвазе бязвыплатную дапамогу, кожны валанцёр ІІ Еўрапейскіх гульняў атрымае заахвочванне ў выглядзе поўнага камплекта формы, сертыфіката ўдзельніка, сувенірную прадукцыю і так званы gift bag (падарункавы пакет), змесціва якога пакуль трымаецца ў сакрэце.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Арышт кіраўніка Nissan абрынуў акцыі трох аўтавытворцаў



Акцыі японскага аўтаканцэрна Nissan абрынуліся пасля навін аб арышце кіраўніка кампаніі Карласа Гона. Пра гэта паведамляе Reuters. Каштоўныя паперы аднаго з найбуйнейшых аўтавытворцаў, якія таргуюцца на Такійскай фондавай біржы, упалі на 6,25 працэнта. Японская пракуратура затрымала Гона і члена савета дырэктараў Грэга Кэлі па падазрэнні ва ўтойванні даходаў. Па версіі следства, з 2011-га па 2015 год яны прыніжалі інфармацыю аб сваіх выплатах амаль на 5 мільярдаў ен. Nissan прызнала абвінавачанні і заявіла аб поўным супрацоўніцтве са следствам. Гону пагражае да 10 гадоў турмы. 22 лістапада на пасяджэнні савета дырэктараў карпарацыі будзе пастаўлена пытанне аб неадкладным звальненні Гона і Кэлі. Таксама Карлас Гон пакуль яшчэ фармальна ўзначальвае трохбаковы альянс Renault — Nissan — Mitsubishi Motors. У агульнай суме гэтая тройка знаходзіцца на першым месцы ў свеце па аб'ёме збыту аўтамабіляў. На фоне скандалу акцыі Renault страцілі 8,4 працэнта цаны, Mitsubishi таксама патаннела на 6 працэнтаў. Карлас Гон — легендарны крызісны менеджар, вядомы тым, што ён здолеў вярнуць прыбытковасць некалькім аўтагігантам. У Японіі Гон — герой коміксаў манга.

## Большасць папулярных курортаў Іспаніі затапіла з-за шторму



Дзясяткі раёнаў Іспаніі, у якіх знаходзіцца большасць папулярных курортаў краіны, затопленыя ў выніку наймацнейшых ліўняў, перадае «Інтэрфакс». Магутны шторм абрынуўся, у прыватнасці, на востраў Тэнэрыфэ і на Балеарскія астравы. Відавочцы паведамілі пра дзесяціметровыя хвалі. У горадзе Малага штармавым ветрам і ліўнем змыла некалькі вулічных кафэ і рэстаранаў. «Папулярныя турыстычныя раёны Іспаніі аказаліся затопленыя ў выніку моцных залеў, якія пачаліся ў суботу. У Галісіі знойдзена цела пажылой жанчыны, яна патанула, калі яе дом затапіла вадой», — піша газета El Confidencial. Адзін чалавек знік без вестак у Андараа (аўтаномная супольнасць Краіна Баскаў) падчас рыбалкі. Трывога аб'яўлена ў 17 з 50 правінцый. У дзевяці правінцыях быў абвешчаны перадапошні, «аранжавы» ўзровень небяспекі, у тым ліку на Балеарскіх астравах і ў Астурыі. Чырвоны (найвышэйшы) узровень небяспекі аб'яўлены ў правінцыях Валенсія і Алікантэ на ўсходзе краіны. Таксама пагрозлівая сітуацыя склалася ў Каталоніі, на паўночным усходзе Іспаніі. Каля 45 тысяч іспанскіх школьнікаў не ходзяць на заняткі з-за непагадзі.

## Майкл Блумберг падорыць сваёй альма-матэр 1,8 мільярда долараў



Мільярдэр Майкл Блумберг (уладальнік інфармацыйнага агенцтва Bloomberg) абвясціў, што ахвяруе сваёй альма-матэр, універсітэту Джона Хопкінса (знаходзіцца ў горадзе Балтымар) $1,8 млрд. Універсітэт адзначае, што дзякуючы ахвяраванню зможа прытрымлівацца прынцыпу «сляпога залічэння» — гэта значыць прыёму студэнтаў зыходзячы з іх акадэмічны вынікаў, па-за залежнасцю ад магчымасці аплачваць навучанне. Універсітэт Джона Хопкінса ўваходзіць у лік найлепшых універсітэтаў свету па версіі Times Higher Education. Майкл Блумберг скончыў яго ў 1964 годзе, атрымаўшы ступень бакалаўра ў электраінжынерыі. Капітал 76-гадовага бізнесмена Forbes ацэньвае ў $46,3 млрд (14-е месца ў свеце). У апошні час амерыканскія СМІ называюць яго магчымым кандыдатам на прэзідэнцкіх выбарах у 2020 годзе. У 2016-м Блумберг таксама разглядаў магчымасць удзелу ў выбарах, прычым як незалежны кандыдат, аднак у выніку падтрымаў Хілары Клінтан. Сам Блумберг адназначнага адказу на пытанне, ці разглядае ён магчымасць удзельнічаць у прэзідэнцкай гонцы ў 2020 годзе, не дае. Ахвяраванне былога мэра Нью-Ёрка стала самым буйным у гісторыі амерыканскіх універсітэтаў.

# БЕЗ ТУБЕРКУЛЁЗУ, ГЕПАТЫТУ І ВІЧ

## Пазбавіцца ад гэтых хвароб рэальна ўжо да 2030 года

**Пытанні лячэння, дыягностыкі і прафілактыкі такіх інфекцыйных хвароб, як туберкулёз, ВІЧ і гепатыт, абмяркоўваюць удзельнікі Рэгіянальнай нарады аб пашырэнні доступу да якасных і недарагіх лекавых прэпаратаў і дыягнастычных сродкаў у краінах рэгіёна Усходняй Еўропы і Цэнтральнай Азіі (ВЕЦА). Яна праходзіць у Мінску 20—22 лістапада.**



— Сёння гэта асноўныя захворванні інфекцыйнай прыроды, якія выклікаюць занепакоенасць у тых краінах, прадстаўнікі якіх сабраліся ў Мінску, — адзначыў **міністр аховы здароўя Валерый МАЛАШКА.** — Гэта тэма актуальная і для Беларусі. Мы маем сур'ёзныя поспехі ў барацьбе з туберкулёзам: адбылося значнае зніжэнне захваральнасці і смяротнасці. Але праблемай з'яўляецца вялікая колькасць устойлівых да лячэння формаў. Мы чакаем шырокага абмеркавання гэтай праблемы, і мяркую, яна знойдзе сваё вырашэнне. Да 2030 года мы павінны пазбавіцца ад цяжару названых хвароб: такую задачу ставіць Сусветная арганізацыя аховы здароўя, і ў нас высокія шанцы з ёй справіцца.

Валерый Малашка нагадаў, што ў Брэсцкай вобласці рэалізуецца пілотны праект па рэарганізацыі фтызіятрычнай службы. У прыватнасці, скарочана знаходжанне хворых на туберкулёз у стацыянарах. Пацыента пераводзяць на амбулаторны этап, калі хвароба перастае несці пагрозу для навакольных. Дзякуючы гэтаму колькасць ложкаў удалося скараціць больш чым на 200, а сродкі накіраваць на закупку сучасных прэпаратаў для лячэння туберкулёзу. Міністр падкрэсліў, што праект прызнаны ўдалым і яго рэалізацыя распаўсюдзіцца на іншыя рэгіёны краіны.

Сёння, па словах міністра, мы маем сур'ёзныя дасягненні ў прафілактыцы і лячэнні ВІЧ-інфекцыі. Павелічэнне колькасці выпадкаў, якое назіралася ў апошнія гады, звязана з паляпшэннем дыягнаставання. ВІЧ-інфекцыі нярэдка спадарожнічае гепатыт С, ім інфікавана тры чвэрці хворых. Пачынаючы з мінулага года выкарыстоўваюцца сучасныя схемы лячэння гепатыту С. Летась праз яго прайшлі 500 пацыентаў. Сёлета за кошт бюджэту былі закуплены прэпараты для лячэння больш як 1,5 тысячы чалавек, налета такіх будзе яшчэ больш.

Схема лячэння ад гепатыту С, куды ўваходзяць і прэпараты, якія вырабляюцца ў Беларусі, паводле інфармацыі міністра аховы здароўя, адна з самых танных у Еўропе.

**Алена КРАВЕЦ.**

Маладзёжны конкурс

# НА ЎРОК — У КІНАТЭАТР

**Другі этап рэспубліканскага конкурсу для вучняў 10-х і 11-х класаў velcom YOUTH распачнецца з самага вялікага інтэрактыўнага ўрока ў краіне. Ужо ў гэтую суботу, 24 лістапада, інтэрактыўны майстар-клас «Майстэрства прэзентацыі» адначасова аб'яднае старшакласнікаў па ўсёй Беларусі. Ён пройдзе ў самай вялікай зале кінатэатра velcom cinema VOKA (у гандлёвым цэнтры Dana Mall). Удзел у ім прымуць больш за 200 старшакласнікаў школ, гімназій і ліцэяў Мінска, а таксама больш як 800 зарэгістраваных удзельнікаў конкурсу з 236 навучальных устаноў Беларусі.**

Сацыяльна-адукацыйны праект velcom YOUTH рэалізуе кампанія velcom пры падтрымцы Міністэрства адукацыі і арганізатараў канферэнцыі TEDx Minsk. **Яго адметнасць у тым, што ўся камунікацыя (ад падачы заяўкі да прэзентацыі ў фінале) будзе адбывацца на беларускай мове.** Падлеткі, якія хочуць змяніць навакольны свет да лепшага, прапануюць сваю тэму ў адным з трох напрамкаў: тэхналогіі, культура або інклюзія.

На мінулым тыдні арганізацыйны камітэт падвёў вынікі збору заявак ад удзельнікаў конкурсу. Самай актыўнай навучальнай установай у краіне стала віцебская сярэдняя школа № 44, дзе адважыліся прапанаваць свае ідэі каля 100 вучняў. Агульная геаграфія праекта ахоплівае амаль 90 населеных пунктаў краіны — ад сталіцы, абласных і раённых цэнтраў да сельскіх школ і школ-інтэрнатаў. Праект velcom YOUTH стаў па-сапраўднаму агульнанацыянальным, дайшоў да самых зацікаўленых і матываваных школьнікаў.

Найбольшую цікавасць ва ўдзельнікаў выклікаў напрамак «Культура» (53 % ад агульнай колькасці заявак). «Тэхналогіі» выбралі 33 % удзельнікаў, а «інклюзію» — 14 %. Беларускія старшакласнікі прапанавалі вельмі разнапланавыя ідэі: ад больш шырокага вывучэння беларускамоўнай спадчыны да выкарыстання віртуальных тэхналогій і дапоўненай рэальнасці для пашырэння даступнасці інфармацыі аб гістарычных мясцінах Беларусі.

На трэцім конкурсным этапе з 20 студзеня па 20 лютага хлопцам і дзяўчатам неабходна будзе рэалізаваць сваю ідэю: падрыхтаваць і правесці нефармальнае адукацыйнае мерапрыемства: майстар-клас, дэбаты ці дыскусію па выбранай тэме свайго праекта.

Аўтары самых сацыяльна значных, сучасных і арыгінальных праектаў трапяць у лік дзесяці фіналістаў. Яны наведаюць TEDxMinsk-2019 і пачнуць працаваць над прэзентацыяй сваёй ідэі з найлепшымі ментарамі. Іх выступленні адбудуцца на выніковым мерапрыемстве TEDxYouth@Minsk у маі 2019 года. Усе дзесяць фіналістаў атрымаюць прызы — мабільныя тэлефоны iPhone Xs, а трое пераможцаў (па адным у кожным напрамку конкурсу) будуць запрошаны на мерапрыемства TEDx у Аўстрыю.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Бізнес

# ЗА РОЎНЫЯ ПРАВЫ

**Сусветны дзень жаночага прадпрымальніцтва ў сярэдзіне лістапада адзначаюць у 144 краінах. З гэтай нагоды ў сталіцы прайшла сустрэча, дзе жанчыны абмяркавалі крыптавалюту, лічбавізацыю і сучасныя тэндэнцыі ў бізнесе.**

**Іаанна КАЗАНА-ВІШНЯВЕЦКІ, пастаянны каардынатар ААН у Беларусі,** прывітала бізнесвумен. Яна адзначыла, што гендарная роўнасць і пашырэнне правоў жанчыны прызнаны крытычна важнымі аспектамі ўстойлівага развіцця. У Мэтах устойлівага развіцця ёсць сем пунктаў, якія датычацца жанчын, і 17 паказчыкаў, па якіх адсочваюць, наколькі жанчыны ўключаюцца ў развіццё на роўных магчымасцях.

«На жаль, на сёння сярэдні жаночы бізнес адстае па памеры і дынаміцы росту ў параўнанні з канкурэнтамі-мужчынамі. Мы можам паглядзець на статыстычныя даныя, — гаворыць Іаанна Казана-Вішнявецкі. — Вядомы факт, што жанчыны ў Беларусі атрымліваюць у сярэднім на 25 % менш, чым мужчыны. І гэта праблема, якая датычыцца і іншых краін. У прыватнасці ў свеце розніца ў заробатнай плаце паміж жанчынамі і мужчынамі 23 %. Другое — гэта статыстыка па доступе да фінансавання. Тут размова ідзе аб жанчынах-лідарах у бізнесе. Імавернасць адмовы ў выдачы крэдыту на развіццё бізнесу для жанчын на 55 % вышэйшая, чым для мужчын».

У Беларусі ў асноўным жанчыны адказваюць за выкананне розных хатніх абавязкаў. Пастаянны каардынатар ААН расказала пра статыстычныя даныя па выніках апытання. Каля 40 % жанчын і толькі 9 % мужчын, якія вядуць бізнес, выконваюць амаль усю працу па доме. 37 % жанчын і толькі 0,74 % мужчын гавораць, што догляд дзяцей з'яўляецца іх абавязкам. Падобныя лічбы і ў адказах на пытанне «Хто застаецца дома, калі дзеці хварэюць?» — 32 % жанчын і толькі 1 % мужчын.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## БАРЫСАЎ СУСТРАКАЕ СВЯТЫНІ

**Частка Пакрова Багародзіцы і часцінка мошчаў велікамучаніка Панцеляймона сёння прыбудуць у Барысаў.**

Святочная сустрэча святынь адбудзецца ў кафедральным саборы Уваскрэсення Хрыстовага ў 16.30. Вернікі змогуць прыняць удзел у хрэсным ходзе і богаслужэнні, арганізаваным у гонар падзеі.

Малебен правядзе епіскап Барысаўскі і Мар'інагорскі Веніямін. На тэрыторыі Барысава і раёна святыні будуць да 28 снежня.

Мошчы і частка Пакрова будуць выстаўлены для ўшанавання і ў іншых населеных пунктах Барысаўскай епархіі. Святыні прыбудуць у Жодзіна, Слабаду, Смалявічы, Мар'іну Горку, пасёлак Дружны, Чэрвень, Лагойск, Зембін і Лошніцу.

«На Барысаўшчыну мошчы велікамучаніка Панцеляймона і частка Пакрова Божай Маці прыбылі з Элісцінскай і Калмыцкай епархіі Рускай праваслаўнай царквы Маскоўскага патрыярхата», — паведамілі ў прэс-службе Барысаўскай епархіі.

Асноўнае палатно Пакрова Прасвятой Багародзіцы — галоўная святыня французскага горада Шартр. Згодна з паданнем, менавіта ў гэтае адзенне ў момант нараджэння Хрыста была ўбрана Божая Маці, якое яна потым захоўвала ўсё жыццё.

Велікамучанік Панцеляймон прызваны лекарам. Па дапамогу да яго звяртаюцца хворыя на цялесныя і духоўныя немачы. Пры жыцці Панцеляймон (на тэрыторыі сучаснай Турцыі, III—IV стагоддзі) быў доктарам, таму яго лічаць заступнікам урачоў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## ЦІ МОГУЦЬ КРЫЛАТЫЯ ЎПАДАЦЬ У СПЯЧКУ?

**А вы ведаеце пра самыя ўстойлівыя памылковыя думкі пра птушак? Так? Тады чаму ў савы ніколі не ідзе кругам галава і ці праўда, што птушкі махаюць крыламі ўверх-уніз? Чаму ў дзятлаў не бывае страсення мазгоў і колькі на самай справе жывуць крумкачы?**

На гэтыя і іншыя пытанні вы атрымаеце экспертны адказ на нясумнай лекцыі «Зоачацвер: птушкі і прадузятасці». Першая ў гэтым сезоне лекцыя адбудзецца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы НАН Беларусі (станцыя метро «Акадэмія навук», вуліца Сурганава, 15). Пачатак 22 лістапада ў 18.30 (працягласць — 1 гадзіна плюс пытанні).

Лекцыю правядзе арнітолаг, спецыяліст грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» па прыродаахоўных пытаннях Сямён Левы. Прэс-служба АПБ нагадвае, што ўваход свабодны, але патрэбна рэгістрацыя па спасылцы: ptushki.org/zoochetverg.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## МАРШРУТКА СУТЫКНУЛАСЯ З АЎТОБУСАМ

**Здарэнне адбылося ў сталіцы днём на вуліцы Матусевіча. У бальніцу трапілі сем чалавек.**

Кіроўца маршрутнага таксі ехаў з боку вуліцы П. Глебкі ў кірунку вуліцы Цімашэнкі. Ён сутыкнуўся з аўтобусам, які рухаўся наперадзе па той жа паласе. Як паведамілі ва УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, з сямі пацярпелых пяць былі дастаўлены ў бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі для пастаноўкі дыягназу. Трох потым адпусцілі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## «РАЗВОДЗІЎ» НА ДАМЫ, ЛАЗНІ І... КАХАННЕ

**Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Фрунзенскага РУУС сталіцы затрымалі 33-гадовага грамадзяніна Германіі, які падазраецца ў здзяйсненні махлярстваў у дачыненні да грамадзян Беларусі і Германіі.**

Устаноўлена, што ў Беларусь мужчына прыехаў у лістападзе мінулага года, скарыстаўшыся магчымасцю бязвізавага рэжыму ўезду. Далей у Мінску адкрыў фірму, якая аказвае паслугі па вырабе дамоў і лазняў з драўлянага бруса.

Аднак, як было ўстаноўлена, фігурант браў перадаплату ў даверлівых мінчан, а свае абавязацельствы перад заказчыкамі не выконваў. У міліцыю ўжо звярнулася 15 пацярпелых грамадзян — жыхароў Мінска і Мінскай вобласці. Папярэдне сума нанесенай шкоды склала больш за 40 тысяч долараў.

Акрамя гэтага аператыўнікі высветлілі, што затрыманы іншаземец таксама ўваходзіў у давер да разведзеных адзінокіх жанчын — жыхарак сталіцы, якім абяцаў сумесную шчаслівую будучыню, і прасіў пазычыць грошай на бізнес. Знаёміўся ў цырульнях, рэстаранах, гандлёвых цэнтрах і г. д.

У адным з эпізодаў яму ўдалося такім чынам завалодаць шасцю тысячамі долараў, якія да гэтага часу ён не вярнуў мінчанцы. У іншым эпізодзе адну з пацярпелых жанчын іншаземец папрасіў на яе імя аформіць тэлевізар у растэрміноўку, які быў неабходны для офіса фірмы. Але, як высветлілася пазней, тэлевізар ён падарыў іншай прыяцельцы, паведамілі ў Фрунзенскім РУУС Мінска.

Далей аператыўнікі ўстанавілі, што затрыманы грамадзянін Германіі знаходзіцца ў рэгіянальным вышуку. На тэрыторыі ФРГ ён падазраецца ў здзяйсненні аналагічных злачынстваў — там таксама мелася фірма і некалькі падманутых дам.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## СЫН ЗАБІЎ БАЦЬКОЎ

**Раніцай 19 лістапада 33-гадовы жыхар аграгарадка Зашыр'е Ельскага раёна накінуўся з нажом на сваіх бацькоў. Ён нанёс некалькі ўдараў 58-гадоваму бацьку і 59-гадовай маці. Бацька ад атрыманых ран памёр на месцы. Маці была дастаўлена ў бальніцу, дзе памерла ноччу 20 лістапада.**

Калі злачынец зразумеў, што нарабіў, ён нанёс удар нажом і сабе. Пасля чаго ў беспрытомным стане быў шпіталізаваны.

Як паведаміла афіцыйны прадстаўнік УСК па Гомельскай вобласці Марыя Крываногава, цяпер праводзіцца комплекс следчых дзеянняў. Прызначаны неабходныя экспертызы. Высвятляюцца матывы і абставіны здзяйснення злачынства.

У дачыненні да зламысніка Ельскі раённы аддзел Следчага камітэта завёў крымінальную справу — замах на забойства дзвюх асоб.

**Сяргей КУЛАКОЎ.**

З нагоды

# АД ДРАЎЛЯНЫХ КІЁСКАЎ ДА «РАЗУМНЫХ» ПАВІЛЬЁНАЎ

## Сёння сістэма «Саюздруку» адзначае 100-гадовы юбілей

**Штодзень на прылаўкі кіёскаў, павільёнаў і крам «Белсаюздруку» паступае больш за 140 тысяч экзэмпляраў газет і часопісаў. Кожны месяц 650 найменняў прэсы знаходзяць свайго чытача. У дзень, калі адна з найстарэйшых сістэм распаўсюджвання друкаванага слова адзначае сваё стагоддзе, успамінаем, з чаго пачыналася яе гісторыя, і расказваем пра навінкі, якія чакаюць пакупнікоў у хуткім часе.**



Так будзе выглядаць «разумны» павільён.

### Рассылка авіяцыяй і газетныя аўтаматы

На пачатку мінулага стагоддзя распаўсюджваннем газет і кніг займаліся арцелі і прыватныя падпісныя канторы. Пакуль 21 лістапада 1918 года Савет народных камісараў не прыняў дэкрэт, згодна з якім са снежня ва ўсіх установах паштова-тэлеграфнага ведамства павінны былі пачаць прадаваць у розніцу перыёдыку і літаратуру. Гэта дазваляла шырока забяспечыць насельніцтва друкаванымі выданнямі.

Работу каардынавала агенцтва «Цэнтрадрук». Праз некалькі гадоў яго ліквідавалі, а распаўсюджванне газет і часопісаў даручылі выдавецтвам. У 1930-м, з-за росту тыражоў і найменняў прэсы, сістэму чарговы раз мадэрнізавалі — стварылі Усесаюзнае аб'яднанне «Саюздрук» з шырокай сеткай гарадскіх бюро. У 1941 годзе ў СССР было адкрыта 5,5 тысячы кіёскаў (толькі ў Мінску іх было 13), дзе выданні прадаваліся ў розніцу і па падпісцы.

У гады Вялікай Айчыннай вайны арганізацыя таксама працягвала працаваць. У першую чаргу цэнтральныя газеты дастаўляліся ў баявыя падраздзяленні. Потым прэсу атрымлівалі тылы арміі, а пасля — насельніцтва. Тыраж размяркоўваўся па прадпрыемствах, школах, калгасах. Для рассылкі прэсы на фронт часта выкарыстоўвалі авіяцыю.

Пасля вайны «Саюздрук» стаў аднаўляць сістэму кіёскаў. У Мінску ў 1950-я гады налічвалася больш за 40 гандлёвых пунктаў. Спачатку яны былі драўляныя, але, калі ў 1960-х гадах «Саюздруку» дазволілі адзін працэнт ад прыбытку накіроўваць на свае патрэбы, іх сталі будаваць з металу і пластыку. Навінкай сталі газетныя аўтаматы.

У 1970-я ў тым жа Мінску ўжо стаяла 185 кіёскаў. Цяперашні **начальнік участка газетна-часопіснай экспедыцыі прадпрыемства Таццяна ПОЙДА,** якая ў тыя гады якраз прыйшла на работу ў «Белсаюздрук», успамінае, што значная доля продажаў прыходзілася на кнігі. У модзе былі Маякоўскі, Дзюма, Мапасан, Мітчэл з яе раманам «Знесеныя ветрам».



Кіёскі савецкіх часоў.

У пачатку 1982 года падпісныя тыражы прэсы складалі два мільёны экзэмпляраў, рознічныя — крыху больш за 400 тысяч. Падпіска вялася праз дзевяць пунктаў горада. Рэалізацыяй перыёдыкі займаліся 270 кіёскаў, 15 крам, 63 аўтаматы для продажу газет. Каля 19 тысяч распаўсюджвальнікаў друку арганізоўвалі падпіску ў школах, інстытутах, на заводах.

А ў 1990-я, у часы дэфіцыту, чэргі ў кіёскі выстройваліся не толькі па прэсу і літаратуру. Як расказвае Таццяна Пойда, у гандлёвых пунктах «Белсаюздруку» можна было знайсці і трыкатаж, і сумкі, і бялізну — і ўсё імгненна разбіралася.

### І газету купіў, і таксі заказаў

Сёння, у век інтэрнэту, важна, каб інфармацыя хутка даходзіла да спажыўца, таму сартаванне прэсы на прадпрыемстве ідзе ў дзве змены.

— Начная, напрыклад, цягнецца з 21 да 3 гадзін ночы. Адзін работнік сартуе газеты і часопісы прыкладна для 40 гандлёвых аб'ектаў. У тры мы павінны ўжо гэту прадукцыю загрузіць у машыны і адправіць па ўсіх кіёсках і крамах, каб зранку пакупнік знайшоў на прылаўку свежую прэсу, — дзеліцца Таццяна Пойда.

Улік руху кніг і часопісаў вядзецца аўтаматызавана. «У распараджэнні спецыялістаў знаходзіцца ўся інфармацыя па рэшце тавару ў рэжыме рэальнага часу, — адзначае **начальнік аддзела праграмавання прадпрыемства Ірына ШУРАВА.** — Аўтаматызацыя дазволіла павысіць хуткасць і якасць абслугоўвання, пашырыць праграмы лаяльнасці і матывацыі пакупнікоў, зрабіць празрыстай работу гандлёвых аб'ектаў. Для эфектыўнага кіравання велізарнай сеткай і паляпшэння фінансавых паказчыкаў мы ўкаранілі сучасную сістэму бізнес-аналітыкі Qlik».

Кіёскі «Белсаюздрук» паступова замяняюцца на сучасныя павільёны. У некаторых з іх працуюць кавярні, дзе наведвальнікі могуць за кубкам кавы ці гарбаты азнаёміцца са свежай прэсай. Трэба сказаць, што новая форма гандлю ў пакупнікоў карыстаецца папулярнасцю. Так, па выніках аналізу выручкі і наведвальнасці павільёнаў мы бачым, што папулярнасць там. Пры замене кіёска на павільён самаабслугоўвання ў сярэднім таваразварот павялічыўся ў два разы. Стала таксама болей падпісчыкаў. А заробак у павільёне ў прадаўца вырас у 2—2,5 раза.

Да стагадовага юбілею прадпрыемства распрацавала канцэпцыю «разумнага» павільёна новага фармату — мультыфункцыянальнага. Наведвальнікі змогуць размаўляць з прадаўцом на любой мове (для гэтага там ёсць анлайн-перакладчык), падзараджаць электронныя прылады, выклікаць таксі і «хуткую», заказваць трансфер у аэрапорт і за межы горада. А ў будучыні — аплачваць «камуналку», набываць білеты на канцэрты і фестывалі і выбіраць падарункавыя сертыфікаты забаўляльных цэнтраў і буйных крам.

Спецыяльна да Еўрапейскіх гульняў — 2019 для замежных гасцей сталіцы ў павільёнах з'явяцца карысныя інтэрактыўныя памочнікі — гарадскі навігатар і электронны кансультант-перакладчык.

У хуткім часе будзе абноўлена інтэрнэт-крама bspechat.by, дзе кожны ахвотны зможа праз смартфон ці камп'ютар заказаць неабходныя тавары ў зручны для яго кіёск і забраць па дарозе дадому. Больш сучасным стане і сайт прадпрыемства souzpechat.by: там знойдзецца актуальная інфармацыя аб падзеях у медыйнай прасторы краіны, вакансіях, навінках прадукцыі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

*Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» віншуе сваіх калег і надзейных партнёраў з «Белсаюздруку» са знакавым юбілеем і жадае здароўя, поспехаў і здзяйснення новых цікавых праектаў!*

# Зялёнае святло для будучай лазні

### АДЗІН ДАКУМЕНТ НА ЎСЁ

Згодна з падрыхтаваным палажэннем, значна ўзмоцнена роля горадабудаўнічага пашпарта. Гэта будзе комплексны дакумент, які змяшчае ў сабе поўную інфармацыю аб зямельным участку.

Цяпер пры будаўніцтве аднакватэрных, блакіраваных жылых дамоў і капітальных гаспадарчых пабудоў на сваіх зямельных участках будучыя домаўладальнікі могуць самастойна выбіраць набор дазвольнай дакументацыі. Гэта можа быць рашэнне выканкама і горадабудаўнічы пашпарт альбо рашэнне выканкама, архітэктурна-планіровачнае заданне, тэхнічныя ўмовы і тэхнічныя патрабаванні.

Калі чалавек хоча размясціць толькі адну пабудову на сваім участку і не мае намеру ажыццяўляць далейшае будаўніцтва аб'ектаў, ён мае права звярнуцца ў выканкам па атрыманне рашэння на будаўніцтва асобна ўзятага дома або хлява. Іншая справа, калі грамадзянін плануе ў будучыні ўзводзіць на зямельным участку некалькі пабудоў. У гэтым выпадку ён можа звярнуцца ў выканкам, які распрацуе і выдасць горадабудаўнічы пашпарт.

У ім будзе паказаны зямельны ўчастак з нанясеннем «зялёных» і «чырвоных» зон. У «чырвонай» зоне будаўніцтва не дапускаецца па проціпажарных, санітарна-гігіенічных нормах. Акрамя таго, у пашпарце будзе паказаны пералік аб'ектаў, якія дапускаюцца для ўзвядзення на канкрэтным зямельным участку. «Гэта можа быць лазня, хлеў, гаспадарчы блок і іншыя пабудовы. Такім чынам, грамадзяніну не трэба будзе зноў ісці ў выканкам для атрымання дадатковага дазволу. Можна будзе будаваць у межах «зялёнай» зоны без прывязкі да пэўнага месца», — удакладніў Арцём Юшкевіч.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

### ПРАСЦЕЙ І ЮРЫДЫЧНЫМ АСОБАМ

Значна прасцей атрымаць дазвольныя дакументы змогуць і арганізацыі для пабудовы шматкватэрных дамоў і іншых аб'ектаў. Прадпрыемству трэба толькі адзін раз звярнуцца ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган, пасля чаго яно будзе атрымліваць поўны набор дазвольнай дакументацыі. Задача выканкама заключаецца ў тым, каб сабраць неабходныя дакументы ад усіх зацікаўленых органаў дзяржаўнага кіравання. Пералік адміністрацыйных працэдур скарачаецца з двух дзясяткаў да адной.

Суб'ект гаспадарання будзе атрымліваць тэхнічныя патрабаванні, тэхнічныя ўмовы, рашэнне выканкама і акт выбару зямельнага ўчастка. Тэрмін «тэхнічныя патрабаванні» ўводзіцца ўпершыню. Гэта звязана з неабходнасцю атрымання пераліку патрабаванняў для бяспечнай эксплуатацыі будынка яшчэ на стадыі выдачы дазвольнай дакументацыі. Для сістэматызацыі практыкі выдачы тэхнічных умоў устанаўліваецца іх адназначнае вызначэнне: гэта дакумент, які змяшчае інфармацыю пра падключэнне (адключэнне) будынка, збудавання да аб'ектаў інжынернай інфраструктуры. Таксама замацаваны пералік інфармацыі, якая павінна змяшчацца ў тэхнічных умовах. Такі падыход накіраваны на ўсталяванне празрыстых умоў вядзення бізнесу.

### РЫХТУЮЦЬ ДАЗВОЛЬНЫЯ ДАКУМЕНТЫ ТОЛЬКІ КУПЫ

Адным з асноўных змяненняў у новай рэдакцыі палажэння Арцём Юшкевіч назваў наданне большай значнасці камунальным унітарным прадпрыемствам (КУП). Гэтыя прадпрыемствы дзейнічаюць у кожным горадзе і ў кожным раёне. Яны былі спецыяльна створаны для падрыхтоўкі дазвольнай дакументацыі.

«Была такая практыка, пры якой дазвольную дакументацыю рыхтавалі альбо КУПы, альбо тэрытарыяльныя падраздзяленні архітэктуры і будаўніцтва. Мы робім упор на тое, што дазвольную дакументацыю робяць КУПы, паколькі яны могуць выпрацаваць адзіныя падыходы, выдаць кансалідаваную, правільную дазвольную дакументацыю», — растлумачыў начальнік упраўлення. Натуральна, такая дакументацыя выдаецца на рукі не бясплатна. Аднак кантраляваць тарыфную палітыку бюджэтнага прадпрыемства значна прасцей, чым прыватніка, заўважыў спікер.

Больш за тое, пастанова прадугледжвае таксама, што выканкамы змогуць прымаць рашэнні аб унясенні змяненняў у дазвольную дакументацыю, калі гэта не прывядзе да парушэння патрабаванняў нарматыўных прававых актаў. Гэта дазволіць аператыўна прымаць рашэнні ў выпадку змянення ўмоў будаўніцтва. Змена тэхнічных умоў і патрабаванняў ажыццяўляецца таксама па рашэнні выканкама.

Палажэнне пашырае пералік асоб, якім выдаецца дазвольная дакументацыя. Раней яна выдавалася толькі заказчыку і забудоўшчыку. Зараз гэта могуць быць яшчэ і падрадчыкі пры будаўніцтве аб'ектаў пад ключ, інжынеры або інжынерныя арганізацыі пры заключэнні дагавора на аказанне інжынерных паслуг па комплексным кіраванні будаўнічай дзейнасцю.

### АЛГАРЫТМ ЗНОСУ АБ'ЕКТАЎ НЕРУХОМАСЦІ

У адпаведнасці з нормамі Дэкрэта № 7 палажэнне прадугледжвае выдачу дазвольнай дакументацыі на знос нявыкарыстаных аб'ектаў.

Дарэчы, да апошняга часу не быў урэгуляваны сам парадак зносу. Было незразумела, якія для гэтага патрэбныя дакументы. Пастановай гэтыя дакументы ўрэгуляваны ў поўным аб'ёме. Новым дакументам паказана, што неабходна звяртацца ў выканкам, атрымліваць рашэнне, у якім будуць прапісваць патрабаванні па адключэнні будынка ад аб'ектаў інфраструктуры.

Акрамя таго, прадугледжана ўзгадненне выканкамам спосабу зносу аб'екта, парадку абыходжання з матэрыяламі і адходамі, а таксама спосабу аднаўлення ўрадлівасці зямель і ўключэння іх у гаспадарчы абарот. Пастанова ўдакладняе парадак ажыццяўлення гэтай працы. Пры звароце ў выканкам суб'ект гаспадарання прыкладае да заявы свае прапановы аб тым, што рабіць з матэрыяламі, якія застаюцца пасля зносу.

Дакумент быў распрацаваны ў мэтах рэалізацыі Дэкрэта № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва». Палажэнне ў новай рэдакцыі ўступіць у сілу з 31 студзеня 2019 года.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ВУЧОБА МОЖА БЫЦЬ У РАДАСЦЬ...

## АДКРЫЦЬ ДЗЕЦЯМ «ТАЯМНІЦУ»

**Актыўная ацэнка (АА)** — менавіта так называюць у Беларусі тэхналогію Formative Assessment (дынамічнае ці фарміруючае ацэньванне), якая стала ў сусветнай адукацыі мэйнстрымам. У Расіі прыжылася назва «фарміруючае ацэньванне». Прыхільнікі актыўнай ацэнкі называюць яе новай адукацыйнай філасофіяй. Яна складаецца з важных элементаў, якія дапамагаюць зрабіць працэс навучання больш скіраваным на асобу кожнага вучня. Чаму філасофія? Таму што патрабуе ад настаўніка прыняць новую ролю і адмовіцца ад стэрэатыпаў, якія склаліся ў традыцыйнай адукацыйнай мадэлі.




Мікалай ЗАПРУДСКІ:
«Мэта — не дэкларацыя намераў настаўніка...».

— Тэхналогія актыўнай ацэнкі ні ў якім разе не зводзіцца толькі да ацэньвання, — падкрэслівае **прафесар кафедры педагогікі і менеджменту адукацыі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Мікалай ЗАПРУДСКІ.** — Гэта стратэгія навучання, у межах якой школьнікі маюць магчымасць пастаянна бачыць і разумець свае поспехі і няўдачы. Актыўная ацэнка падказвае вучню, у якім кірунку яму рухацца далей, матывуе і прымушае браць на сябе адказнасць за свае веды. Актыўная ацэнка — інтэрактыўная тэхналогія, заснаваная на пастаяннай зваротнай сувязі.

**«Вока настаўніка нацэлена ў першую чаргу на пошук памылак. Правяраючы сшыткі, мы менавіта іх шукаем, а трэба знайсці і станоўчыя моманты».**

Мікалай Запрудскі канстатуе: часта вучні не ведаюць мэты і не могуць зразумець, што яны робяць на тым ці іншым уроку. А калі адкрыць дзецям «таямніцу», навошта яны вучацца, разам сфармуляваць мэту ўрока, то можна зрабіць іх сваімі саюзнікамі.

Нікога не трэба пераконваць у тым, што мэта настаўніка і мэта вучня знешне выглядаюць па-рознаму. Але вельмі важна, каб яны загучалі аднолькава, а для гэтага трэба перакласці мэту настаўніка на даступную вучню мову. Ці настаўнік можна прымяніць прыём «Набор мэт»: вучні выбіраюць з прапанаваных толькі тыя, якія ім па сілах і якія для іх цікавыя. Так працуе адна з вядучых ідэй актыўнай ацэнкі — магчымасць свядомага выбару.

— Мэта не можа быць фармальнай, — папярэджвае Мікалай Запрудскі. — Яна павінна ўказваць на тое, што будзе правярацца на выхадзе з урока, і быць дасягальнай для выканання да моманту, калі празвініць званок. Вельмі моцны варыянт — стварэнне праблемнай сітуацыі, калі навучэнцы прыходзяць да высновы, што для яе вырашэння неабходна штосьці ведаць і ўмець. І гэта «штосьці» яны называюць самі. Такім чынам школьнікі самастойна вызначаюць сваю мэту. Мэта павінна быць канкрэтнай: дакладна вызначаць тыя веды і ўменні, якімі, як мяркуецца, авалодаюць навучэнцы. Мэта — гэта ўяўленне аб выніках, якіх мы імкнёмся дасягнуць, а не дэкларацыя намераў настаўніка.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ГІПОТЭЗА, ЗАГАДКА, СІТУАЦЫЯ...

*«У бацькі было дзве дачкі. Вырашыў ён аддаць іх замуж. Па правілах жаніх павінен быў узяць у жонкі старэйшую, але яму вельмі падабалася малодшая дачка, якая замуж не збіралася. І ён паставіў умову: «Ажанюся з той, у якой хутчэй закіпіць вада ў чайніку». На кім ён ажаніўся і чаму?» Як вы думаеце, ці цікава будзе васьмікласнікам шукаць на ўроку фізікі адказ на гэта пытанне?*

— А вось вам яшчэ прыклады выдатных ключавых пытанняў, сфармуляваных настаўнікамі, — кажа Мікалай Запрудскі. — «Першая сусветная вайна — выпадковасць або заканамернасць?», «Савецкая беларусізацыя 1920-х гадоў: «Залатое дзесяцігоддзе» ў гісторыі беларускай мовы або «пункт незвароту»?», «Чаму лічыцца, што грамадзянская вайна прыносіць для краіны і яе людзей больш бедстваў, чым вайна з іншай краінай?», «Якім магло быць заканчэнне вайны 1812 года, калі б Напалеон адмяніў прыгоннае права і аднавіў Рэч Паспалітую?».

Ключавое пытанне — гэта той «кручок», які чапляе ўвагу вучня і не адпускае, пакуль задача не будзе вырашана. Такія пытанні звязваюць матэрыял падручніка з жыццём. На іх не адкажаш адразу: трэба даследаваць і вывучаць. Яны ствараюць пазнавальную напружанасць у класе, матывуюць, на іх можна пабудаваць увесь урок. Але іх не заўсёды лёгка прыдумаць. Гэта можа быць пытанне-праблема, пытанне-гіпотэза, загадка, заданне, тэзіс, сітуацыя, малюнак ці здымак, калаж ці нават паводзіны настаўніка — калі ён стварае пэўную сітуацыю на ўроку.

Яшчэ адна «фішка» актыўнай ацэнкі — метад непадымання рук. Заўважана, што першая ўзнятая рука «выключае» з пошуку адказаў прыкладна палову вучняў у класе. Таму многія з прыхільнікаў АА выклікаюць вучняў для адказу з дапамогай жэрабя, напрыклад шляхам выцягвання палосак з прозвішчамі.

— Мой знаёмы настаўнік хіміі выкарыстоўвае для гэтых мэт мяшок з грэцкімі арэхамі, на якіх прастаўлены лічбы, — адказвае той вучань, які пад гэтай лічбай запісаны ў класным журнале, — расказвае Мікалай Запрудскі. — На апошнім у навучальным годзе ўроку адбываецца ўрачыстае паяданне арэхаў вучнямі. А да 1 верасня педагог закупляе новы мяшок... Правіла непадымання рукі змяншае для вучняў магчымасць адседзецца ў глядзельнай зале, нават калі ідзе работа ў групе.

**«Вучні не любяць, калі іх ігнаруюць, а пахвала іх стымулюе... Навучанне не будзе эфектыўным, калі пазбавіць дзіця нават шанцу на поспех».**

## ЗНОЎ «ДВОЙКА»?..

— Уявіце сябе маладым педагогам, — прапануе **начальнік Цэнтра прафесійнага развіцця і інавацыйнай адукацыі АПА Алена РАДЗЕВІЧ.** — На вашым уроку прысутнічаў настаўнік-метадыст ці, напрыклад, намеснік дырэктара. Гэта быў трэці ці чацвёрты самастойны ўрок у вашым жыцці, таму вы з трывогай рыхтуецеся пачуць меркаванне метадыста ці кіраўніка. А цяпер падумайце, як бы вы паўплывалі апісаныя ніжэй сітуацыі на вашу ўпэўненасць у сабе, матывацыю і эфектыўнасць працы? Першы варыянт — метадыст сыходзіць з класа, не сказаўшы ні слова. Другі — метадыст без перапынку хваліць ваш урок, нават тыя яго моманты, якія відавочна былі няўдалымі. Трэці — метадыст прапануе падрабязны аналіз памылак, якія вы зрабілі, тлумачыць, як можна іх пазбегнуць. Чацвёрты — метадыст хваліць некаторыя аспекты праведзенага ўрока, крытыкуе іншыя аспекты, тлумачыць, што і як можна палепшыць, а заканчвае сцвярджэннем, што ўвогуле ўрок быў удалы. Пяты — як і ў папярэднім пункце, вы атрымалі сумесь пахвалы і крытыкі, але ў цэлым урок быў прызнаны пасрэдным. Калі б пасля кожнага ўрока вы чулі такое ж меркаванне, то як бы вы адчувалі сябе пасля 30 урокаў? Наколькі гэта дапамагло б вам вучыцца? Малаверагодна, што рэакцыя навучэнцаў на пахвалу і крытыку будзе моцна адрозніваецца ад вашай уласнай. Так, вучні не любяць, калі іх ігнаруюць, а пахвала іх стымулюе... Навучанне не будзе эфектыўным, калі пазбавіць дзіця нават шанцу на поспех. І зусім іншая справа, калі поспехі прызнаюцца і ацэньваюцца: у гэтым выпадку і да абгрунтаванай і канструктыўнай крытыкі навучэнцы паставяцца, хутчэй, як да карыснай...

**«Бываюць урокі, на якіх дзеці працуюць па прынцыпе «калі не дабяжым, дык хоць сагрэемся».**

«Крытэрыі ацэнкі (**НаШтоБуЗУ — на што буду звяртаць увагу)** — адзін з найважнейшых сродкаў тэхналогіі АА, — падкрэслівае Алена Радзевіч. — Гэта, так бы мовіць, кантракт паміж вучнем і педагогам на канкрэтны ўрок. Калі педагог адразу вызначае крытэрыі поспеху, вучань дакладна ведае, якую работу ён павінен выканаць, якімі будуць чаканні настаўніка, а настаўнік не мае праблем з ацэньваннем працы вучня. Бываюць урокі, на якіх дзеці працуюць па прынцыпе «калі не дабяжым, дык хоць сагрэемся» ці не ведаюць, куды бегчы. А «НаШтоБуЗУ» — гэта маркеры, каб вызначыцца, ці не збіліся са шляху да мэты.

Ну а фундаментам актыўнай ацэнкі з'яўляецца пастаянная інтэрактыўная зваротная сувязь. «Алесь, на жаль, ты не справіўся з рашэннем задачы! Зноў «двойка»!» — гэта не зваротная сувязь, бо вучань атрымлівае ад настаўніка не каментарый з рэкамендацыямі па паляпшэнні сваіх вынікаў, а адразу адзнаку, — тлумачыць спецыяліст АПА. — Давайце прызнаемся: вока настаўніка нацэлена ў першую чаргу на пошук памылак. Правяраючы сшыткі, мы менавіта іх шукаем, а трэба знайсці і станоўчыя моманты, бо дзіцяці патрабуецца матывацыя. Добры каментарый павінен быць звязаны з крытэрыямі «НаШтоБуЗУ» і ўключаць чатыры абавязковыя элементы: падкрэсліванне станоўчых бакоў працы вучня, указанне на тое, што павінна быць выпраўлена, над чым трэба папрацаваць дадаткова, падказкі, як гэта можна зрабіць, і парады, у якім напрамку вучань павінен працаваць далей. Проста сказаць «тут дрэнна, тут дрэнна і тут дрэнна» няправільна. Замест адзнакі ў балах настаўнік каментуе дзейнасць вучня на ўроку, ажыццяўляе зваротную сувязь, якая павінна заахвочваць да далейшай працы. Крытэрыяльная (дадаткова да бальнай) ацэнка — адзін з асноўных прынцыпаў тэхналогіі актыўнай ацэнкі.




Алена РАДЗЕВІЧ: «НаШтоБуЗУ» — гэта кантракт паміж вучнем і педагогам на канкрэтны ўрок».



Аляксандр ПІМЕНАЎ:
«Бацькам уласцівая вельмі моцная звычка — ацэньваць усё ў балах».

## АДЗНАКА ДЛЯ БАЦЬКОЎ?

**Заслужаны настаўнік Расійскай Федэрацыі, кандыдат гістарычных навук, намеснік дырэктара маскоўскай школы № 2116 Аляксандр ПІМЕНАЎ** падзяліўся вынікамі праведзенага ў чатырох расійскіх рэгіёнах даследавання. Яно ахапіла каля 1,5 тысячы навучэнцаў з 4-га па 10-ы класы, каля 200 педагогаў і 62 дырэктары школ, а прадметам вывучэння сталі праблемы ацэньвання адукацыйных дасягненняў навучэнцаў у сучаснай школе. Высветлілася, у прыватнасці, што вучні і настаўнікі маюць розныя ўяўленні адносна існуючай сістэмы ацэньвання на ўроку і яе аб'ектыўнасці, уключаючы разуменне крытэрыяў. Так, толькі 45 % апытаных школьнікаў заявілі, што яны разам з настаўнікам вызначаюць мэты ўрока. А настаўнікі ў гэтым упэўнены, як кажуць, на ўсе сто! Не сумняваюцца ў аб'ектыўнасці ацэньвання толькі 43 працэнты школьнікаў, прычым з пятага па дзясяты клас упэўненасць у аб'ектыўнасці ацэньвання зніжаецца. Між іншым, крытэрыі ацэньвання разумеюць усяго 49 працэнтаў школьнікаў. Затое 99 (!) працэнтаў педагогаў абсалютна ўпэўнены ва ўласнай аб'ектыўнасці!

«Што ў ацэньванні вучэбных дасягненняў навучэнцаў з'яўляецца для вас найбольш важным?» — пацікавіўся ў педагогаў. 71 % з іх адказалі: «Наяўнасць свайго пункту погляду». 69 % указалі на важнасць умення прымяніць вывучанае на практыцы, 52 % — на веданне вучэбнага матэрыялу, 47 % — на ўзаемадзеянне з іншымі навучэнцамі... Прычым усім гэтым заявам не знайшлося пацвярджэння пры апытанні школьнікаў.

Навучэнцы больш крытычна ставяцца да адзнакі. 88 працэнтаў настаўнікаў лічаць адзнаку ў балах матывавальным фактарам. Сярод школьнікаў такое меркаванне падзяляюць толькі 35 % ад агульнай колькасці апытаных, а сярод дырэктараў — 40 %. Кіраўнікам задалі яшчэ адно важнае пытанне: «Хто, з вашага пункту погляду, з'яўляецца галоўным зацікаўленым бокам у ацэньванні якасці адукацыі і акадэмічных поспехаў навучэнцаў з выкарыстаннем бальнай сістэмы?» На першым месцы аказаліся бацькі (65 %), затым навучэнцы (54 працэнты), настаўнікі (46 %), органы кіравання адукацыяй (24 %) і адміністрацыя (8 %).

— На жаль, бацькам уласцівая вельмі моцная звычка — ацэньваць усё ў балах. І гэта сур'ёзная праблема, — падкрэслівае Аляксандр Піменаў. — Яны не разумеюць, навошта штосьці змяняць, баяцца зніжэння паспяховасці ў дзіцяці. А дзеці намнога больш адкрытыя да перамен. І нават кіраўнікі школ больш адкрытыя, чаго не скажаш пра настаўнікаў. Апошнія ведаюць пра новыя падыходы ў ацэньванні, але рэалізуюць іх толькі эпізадычна.

**99 (!) працэнтаў педагогаў абсалютна ўпэўнены ва ўласнай аб'ектыўнасці!**

Аляксандр Піменаў лічыць, што менавіта на дзяцей трэба абапірацца пры ўкараненні фарміруючага ацэньвання. Дырэктараў школ таксама можна зрабіць сваімі саюзнікамі. Ён упэўнены ў тым, што рашэнні ў адукацыі трэба прымаць на падставе фактаў і даных. А ўсе міжнародныя даследаванні сведчаць, што фарміруючае ацэньванне (у Беларусі — актыўная ацэнка. — **Аўт.**) — ключавая пазіцыя для паляпшэння адукацыйных вынікаў школьнікаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «СПЕЦРЕМОНТ», 220036, г. Минск, Бетонный проезд, 13, тел./факс 8017-213-62-05 |

**Изолированное помещение, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Могилевская, 14**

| № лота | Наименование (Назначение) | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| 1 | **Пристроенное помещение мастерской и наплавочного отделения** (помещение неустановленного назначения) | 333,9 кв. м | 350/D-239309 |

**Начальная цена с НДС 20 %: 113 640,00 белорусских рублей BYN**
**Шаг аукциона: 5 682,00 белорусских рублей BYN**

**Капитальные строения, расположенные по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Крупской, 224**

| № п/п | Наименование (Назначение) | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| 2 | **Здание механической мастерской** (здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции)) | 1 085 кв. м | 700/С-85219 |

Составные части и принадлежности: двухэтажное каменное здание механической мастерской с пристройкой, тремя сараями

**Сведения о земельном участке:** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования общ. пл. 0,1426 га для использования под здание мастерских

**В состав лота входит следующее оборудование:** электрокран-балка, инв. № 2148; теплосчетчик ТЭМ-104-2dy 50/50, инв. № 21802; контейнер для хранения пропана и кислорода, инв. № 20807

| | |
|---|---|
| **Обременения** | Договор аренды. Подробная информация на сайте www.cpo.by |

**Начальная цена с НДС 20 %: 342 768,00 белорусских рублей BYN**
**Шаг аукциона: 17 138,40 белорусских рублей BYN**

| | | | |
|---|---|---|---|
| 3 | **Здание гаража** (здание специализированное автомобильного транспорта) | 45 кв. м | 700/С-85220 |

Составные части и принадлежности: Одноэтажное каменное здание гаража со складом

**Сведения о земельном участке:** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования общ. пл. 0,0055 га для использования под гараж-склад

**Начальная цена с НДС 20 %: 10 200,00 белорусских рублей BYN**
**Шаг аукциона: 510,00 белорусских рублей BYN**

**Оборудование, спецтехника, расположенная по адресу: г. Могилев, ул. Крупской, 224**

| № лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год введения в эксплуатацию | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|---|---|
| 4 | 20824 | Лебедка электрическая 0,75 т | 360,00 | 18,00 |
| 5 | 2263 | Электролебедка ЛМ-3 г/п 1,2 т | 2 640,00 | 132,00 |
| 6 | 2192 | Выпрямитель сварочный ВС-600 | 1 200,00 | 60,00 |
| 7 | 2211 | Пила маятниковая | 432,00 | 21,60 |
| 8 | 2198 | Пресс кузнечный | 4 320,00 | 216,00 |
| 9 | 2256 | Станок сверлильный 2Н118 | 1200,00 | 60,00 |
| 10 | 27775 | Станция насосная | 2 880,00 | 144,00 |
| 11 | 21753 | Шасси самоходное ВТЗ-30 СШ (рег. номер КА-7 0862), кузов (VIN) 001426 | 9 000,00 | 450,00 |
| **Оборудование, расположенное по адресу: Минский р-н, Петришковский с/с, 25, район д. Захаричи** | | | | |
| 12 | 2054 | Автопогрузчик 5 тн., тип 3Т3-511, 1992 г. | 7 200,00 | 360,00 |
| 13 | 4645 | Автопогрузчик Б8-2733, 3,2 тн, 1992 г. | 6 120,00 | 306,00 |
| 14 | 21784 | Тиски станочные, 2008 г. | 168,00 | 8,40 |
| 15 | 21667 | Вальцы листогибочные УВ-1860-083-77-59, 2006 г. | 9 000,00 | 450,00 |
| 16 | 21738 | Выпрямитель сварочный ВД-306У3, 2007 г. | 276,00 | 13,80 |
| 17 | 21740 | Выпрямитель сварочный ВД-306У3, 2007 г. | 276,00 | 13,80 |
| 18 | 21661 | Выпрямитель универсальный ВДУ-506СЭ, 2006 г. | 636,00 | 31,80 |
| 19 | 2768 | Машина Р-50, 1973 г. | 2 880,00 | 144,00 |
| 20 | 4676 | Ножницы НК-3418, 1993 г. | 6 720,00 | 336,00 |
| 21 | 15002 | Пила маятниковая ПМ400, 1987 г. | 216,00 | 10,80 |
| 22 | 21650 | Полуавтомат сварочный ПДГО-510, 2006 г. | 384,00 | 19,20 |
| 23 | 4630 | Пресс гидравлический П6-326, 1982 г. | 2 040,00 | 102,00 |
| 24 | 4662 | Пресс-ножницы Н 5222А, 1973 г. | 1 560,00 | 78,00 |
| 25 | 117 | Проволокоподающее устройство ППУ-504, 2001 г. | 288,00 | 14,40 |
| 26 | 4614 | Станок 2Н125л сверлильный, 1981 г. | 2 400,00 | 120,00 |
| 27 | 4646 | Станок 8Г-662, 1982 г. | 2 640,00 | 132,00 |
| 28 | 4666 | Станок вертикально-фрезерный 6Н11, 1985 г. | 4 200,00 | 210,00 |
| 29 | 4668 | Станок заточный В3-164, 1967 г. | 936,00 | 46,80 |
| 30 | 21367 | Станок плоскошлифовальный 3НГ-71, 1970 г. | 5 640,00 | 282,00 |
| 31 | 21666 | Станок поперечно-строгальный 7А37, 2006 г. | 5 040,00 | 252,00 |
| 32 | 4803 | Станок сверлильный МН18, 1979 г. | 2 640,00 | 132,00 |
| 33 | 4654 | Станок товарно-винторезный 16К20, 1983 г. | 5 520,00 | 276,00 |
| 34 | 21665 | Станок токарно-винторезный 16К20, 2006 г. | 5 520,00 | 276,00 |
| 35 | 4802 | Станок универсальный фрезерный 6Т80Ш, 1982 г. | 5 280,00 | 264,00 |
| 36 | 4637 | Станок фрезерный 6Р82, 1963 г. | 5 040,00 | 252,00 |
| 37 | 4606 | Токарно-винторезный станок 1М-63, 1979 г. | 5 520,00 | 276,00 |
| 38 | 21440 | Установка СМЖ-357, 2003 г. | 1 800,00 | 90,00 |
| **Оборудование, расположенное по адресу: г. Минск, Бетонный проезд, 11** | | | | |
| 39 | 166 | Инвертор сварочный ММА ARC 400 В, 2014 г. | 360,00 | 18,00 |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственные лица: **по лоту № 1** – Коледенко Михаил Викторович, тел. 80 29 697-26-32; **по лотам №№ 2–11** – Каминский Павел Иванович, тел. 8 029 659-14-39, **по лотам №№ 12–39** – Расолько Александр Александрович, тел. 8 029 570-21-84

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона** www.cpo.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты: по лотам №№ 1–3** не более 30 (тридцати) дней со дня заключения договора купли-продажи (если иное не предусмотрено договором купли-продажи.
**По лотам №№ 4–39** не более 10 (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **22.12.2018** в 14.00 по адресу**: г. Минск, Бетонный проезд, 11, ОАО «СПЕЦРЕМОНТ»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **20.12.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by** |

## Извещение о проведении 22 декабря 2018 года торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества, находящегося в хозяйственном ведении унитарного предприятия «АгроМАЗ»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | «Здание АБК-теплицы» общей площадью 1073,8 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Березинский р-н, Березинский с/с, 1 (инв. номер в ЕГРНИ 611/С-30407);<br>«Котельная теплицы» общей площадью 550,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Березинский р-н, Погостский с/с, г. Березино (инв. номер в ЕГРНИ 611/С-27365) |
| **Сведения о земельном участке** | Площадь – 6,6463 га, кадастровый номер 620483800001000013, целевое назначение: земельный участок для ведения товарного сельского хозяйства |
| **Продавец имущества** | Сельскохозяйственное унитарное предприятие «АгроМАЗ», 223329, Минская область, Березинский район, д. Любушаны |
| **Организатор торгов** | Государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов без учета НДС** | 269 905,82 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 26 900,00 бел. руб. |
| **Условие торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов |

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, находящегося в хозяйственном ведении унитарного предприятия «АгроМАЗ».

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона (с условиями) на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) по согласованию с продавцом в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся 22 декабря 2018 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 21.11.2018 по 20.12.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(01715) 64-632 (унитарное предприятие «АгроМАЗ»).

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Оршаагропроммаш», Витебская обл., г. Орша, ул. Ленина, 215 |

**Предмет аукциона**

**Лот № 1 –** Объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Производственный корпус цеха** (здание специализированное для металлургического производства и металлообработки) | 16 006,4 кв. м | 110/С-110941 |
| Адрес: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79/13 | | |
| **Площадка завода металлоконструкций** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства) | 3 014,0 кв. м | 110/С-113604 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79, площадка завода металлоконструкций | | |
| **Открытый склад металла** (сооружение специализированное складов, хранилищ). Составные части и принадлежности: площадка | 1 723,0 кв. м | 110/С-112475 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79, открытый склад металла | | |
| **Ливневая канализация 1** (сооружение специализированное водохозяйственного назначения). Составные части: семнадцать трубопроводов (а1 – а17) | 879,5 м | 110/С-114664 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, 79, ливневая канализация 1 | | |
| **Ливневая канализация 2** (сооружение специализированное водохозяйственного назначения). Составные части: одиннадцать трубопроводов (а1 – а11) | 281,3 м | 110/С-114665 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, 79, ливневая канализация 2 | | |
| **Водопровод** (сооружение специализированное водохозяйственного назначения). Составные части: А – участок водопроводной сети: а1 – трубопровод, а2 – трубопровод, а3 – трубопровод ввод, а4 – трубопровод ввод, а5 – трубопровод ввод, а6 – трубопровод, а7 – трубопровод | 618,7 м | 110/С-114547 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, 79, водопровод | | |
| **Производственный водопровод** (сооружение специализированное водохозяйственного назначения). Составные части и принадлежности: А – водопроводная сеть: а1 – трубопровод, а2 - трубопровод, а3 – трубопровод ввод, а4 – трубопровод ввод, а5 – трубопровод ввод, а6 – трубопровод ввод, а7 – трубопровод, а8 – трубопровод ввод, а9 – трубопровод ввод, а10 – трубопровод ввод | 1 160,5 м | 110/С-114545 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, 79, производственный водопровод | | |
| **Хозяйственная фекальная канализация** (сооружение специализированное водохозяйственного назначения). Составные части и принадлежности: восемь трубопроводов | 1 053,8 м | 110/С-114546 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, 79, хозяйственная фекальная канализация | | |
| **Телефонизация (слаботочные сети)** (сооружение специализированное связи). Составные части и принадлежности: А – Телефонизация (слаботочные сети), а1 – участок кабельной телефонизации, а2 – участок кабельной телефонизации | 514,5 м | 110/С-115057 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, 79, телефонизация (слаботочные сети) | | |
| **Кабельные линии электропередачи 10 кВ** (сооружение специализированное энергетики) | 862 м | 110/С-115059 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, 79, кабельные линии электропередачи 10 кВ | | |
| Трансформатор 630 Квт | - | - |
| Трансформатор 630 Квт | - | - |

***Сведения о земельном участке***: пл. **2,4736** га, предоставлен продавцу для обслуживания производственного корпуса цеха, открытого склада металла, площадки завода металлоконструкций на праве постоянного пользования

**Начальная цена с НДС 20 % – 4 805 109,17 бел. руб.**

**Лот № 2** – объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Цех блоков** (здание неустановленного назначения). Составные части и принадлежности: подвал | 3 748 кв. м | 110/С-85251 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79 | | |
| **Автодорога бетонных блоков** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства). Составные части: автодорога бетонных блоков (А), два покрытия (а1, а2) | 9 048 кв. м | 110/С-112843 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79, автодорога бетонных блоков | | |
| **Здание гаража** (здание специализированное автомобильного транспорта) | 30,5 кв. м | 110/С-111500 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79/16 | | |
| **Здание гаражей** (здание специализированное автомобильного транспорта) | 459,7 кв. м | 110/С-111499 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79/17 | | |
| **Открытый склад готовой продукции** (сооружение специализированное складов, хранилищ). Составные части: (А)-площадка | 4 226 кв. м | 110/С-112473 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79, открытый склад готовой продукции | | |
| **Склад извести** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ). Составные части: бетонный подвал, навес из металлических столбов, емкости. | 119,6 кв. м | 110/С-111540 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79/ 26 | | |
| **Склад цемента** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ). Составные части: одноэтажное кирпичное здание склада цемента с подвалом и навесом | 63,0 кв. м | 110/С-85258 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79 | | |
| **Склад сыпучих материалов** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ). Составные части: две кирпичные пристройки, три бетонных, одна шиферная, одна из металлического каркаса обшитая шифером, два навеса | 1885,3 кв. м | 110/С-85261 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79/24 | | |

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельных участках** | пл. **2,2139** га, предоставлен продавцу для обслуживания цеха блоков, автодороги бетонных блоков, здания гаража, здания гаражей, открытого склада готовой продукции, склада извести, склада цемента, склада сыпучих материалов на праве постоянного пользования |
| | пл. **0.4901** га, предоставлен продавцу для обслуживания склада сыпучих материалов на праве постоянного пользования |

**Начальная цена с НДС 20 % – 1 565 670,43 бел. руб.**

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Задаток 1 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 22.12.2018 в 11.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 21.12.2018 до 17.00** по указанному адресу

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. Email: auction@cpo.by**

Свет захапленняў

# ГІМНАЗІСТ У КРАІНЕ САВЕТАЎ

## «Гэта вельмі чалавечныя экспанаты...»

**Гродзенскі адзінаццацікласнік Уладзіслаў ФОРЫСЬ ужо некалькі гадоў актыўна збірае прадметы савецкай эпохі. А мясцовыя камуністы нават запрашаюць школьніка на свае сходы.**



Усё пачалося з машынак «Аўталегенды СССР». Потым з'явіліся значкі, сцягі, плакаты, партрэты і бюсты савецкіх дзеячаў і многае іншае. Аб захапленні вучня 11-га класа ведаюць не толькі аднакласнікі, але і ўся гімназія № 2.

Уладзіслаў дэманструе свае экспанаты — вось вымпелы за ўдарную працу, значкі «Ударнік пяцігодкі», камсамольскі і піянерскі значкі,



кнігі пра камсамол, чырвоны банцік, з якім маці хадзіла на дэманстрацыю. Прадметы больш ранняга перыяду — ваенныя медалі, песеннік 41-га года — выданы ў Ленінградзе, пасведчанне аб нараджэнні 1937 года, так званая рэйсавая прадуктовая картка.

— Такія талоны выкарыстоўваліся адразу пасля вайны. Гэтыя, напрыклад, выдаваліся на дэкаду ў лістападзе 1945 года. На аднаго чалавека прыпадала пяць грамаў тлушчу, 100 грамаў мяса, 40 грамаў крупы... Пры страце не ўзнаўляліся. Тут на некалькі чалавек выдадзена, можа, на сям'ю. Я знайшоў іх у песенніку, магчыма, яны належылі камусьці з жыхароў горада, але чаму іх не атаварылі — невядома, — расказвае Уладзіслаў.

У яго калекцыі толькі тыя медалі, што перадалі знаёмыя альбо родныя. Даведаўшыся пра захапленне хлопца, яны з радасцю папаўнялі яго калекцыю працоўнымі і ваеннымі ўзнагародамі.

— Я люблю хадзіць па антыкварных крамах, шукаць нешта цікавае на рынках, — кажа хлопец, — многія экспанаты даволі дарагія, напрыклад грамафоны, патэфоны і нават пласцінкі. Медалі таксама дорага каштуюць, але я іх у любым выпадку не купіў бы. Людзі заваёўвалі іх сваім жыццём, і гандляваць імі, лічу, непрыгожа. Гэта вельмі «чалавечныя» экспанаты.

У гімназіста ёсць і свае ўзнагароды. Гэта юбілейныя медалі, якія яму ўрачыста ўручылі з нагоды дня нараджэння Леніна і 100-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Уладзіслаў прызнаецца, што ён быў узрушаны, калі яму, самаму маладому, уручылі гэты памятны знак. Сёлета да 100-годдзя камсамола падаравалі кнігу, дзе адлюстравана ўся гісторыя маладзёжнай арганізацыі ў плакатах і фотаздымках. У самога Уладзіслава ёсць фотаальбом пра Леніна, выдадзены ў 1980 годзе. Па тых часах ён каштаваў немалыя грошы — 7 рублёў, гэта падарунак дзядулі. Дарэчы, менавіта дзядулі і бабулі адыгралі важную ролю ў захапленні ўнука савецкай эпохай. Яны былі актыўнымі камсамольцамі, некаторыя — камуністамі. Многа расказвалі пра савецкі перыяд: як працавалі, які быў горад, як наладжвалі побыт, вандравалі.

— Я люблю слухаць іх расказы, — кажа хлопец, — і ўяўляю сабе тыя карціны. Гэта мінулае, аб якім можна даведацца ад жывых сведак. З'явілася і жаданне сабраць прадметы той эпохі. Праўда, бацькі з асцярогай глядзелі на маё захапленне і лічылі гэта вельмі спецыфічным хобі для падлетка. Памятаю, як мама без энтузіязму назірала, калі я прынёс дамоў бюст Леніна. У мяне ёсць і прыжыццёвы барэльеф Сталіна, які прывезлі з Гродзенскага раёна.

З расказаў бабулі Уладзіслаў даведаўся, што ў Гродне было нямала помнікаў Сталіну. Нават бачыў фота аднаго з іх, дзе Ленін і Сталін сядзелі разам на лаўцы. Помнік знаходзіўся каля ўваходу ў гарадскі парк.

Для Уладзіслава гэтыя веды каштоўныя яшчэ і таму, што ён думае звязаць свой лёс з прафесіяй гісторыка. Таму за камп'ютарам па большай частцы любіць праглядаць адкрытыя архівы.

Свайго хобі Уладзіслаў не цураецца, наадварот, гатовы прадэманстраваць экспанаты кожнаму, хто пажадае. Не раз прыносіў цікавыя рэчы на класныя гадзіны і расказваў аб іх. Аднакласнікі ўспрымаюць такое захапленне з павагай. Многія прадметы датычацца былых кіраўнікоў дзяржавы, што заўсёды цікава. Напрыклад, прыжыццёвы зборнік выступленняў Сталіна, дзе многія радкі падкрэслены алоўкам былых уладальнікаў выдання. Такія экспанаты хвалююць і самога хлопца. У ліку каштоўных ён назваў і сцяг БССР, які яму падаравала класны кіраўнік Вольга Віктараўна. Па-першае, гэта сімвал эпохі, а па-другое, больш распаўсюджанымі былі сцягі СССР, а саюзных рэспублік — значна менш.

— Шмат было за гэты час эпахальных падзей — перамога ў вайне, адкрыццё космаса, падняццё цаліны. Усё, што здавалася немагчымым, — стала магчымае. Многае з тых часоў варта перанесці і ў нашу сучаснасць. Гэта дапамагае фарміраваць характар, — упэўнены юнак.

**Вольга ШАСТАК, класны кіраўнік:**

— Нельга сказаць, што ён затрымаўся ў той эпосе. Збор экспанатаў пашырае светапогляд і дае дадатковыя веды па гісторыі. Ёсць магчымасць даведацца аб фактах, якіх няма ў падручніках. І, вядома, нічым дрэнным гэта не пагражае. Наадварот, спрыяе фарміраванню правільных каштоўнасцяў. Гэта значны плюс. Нездарма Уладзіслава абралі старастам класа і сакратаром школьнай арганізацыі БРСМ.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

Выпрабавана на сабе

# І ЗАРАД З ПАДНЯБЕСНАЙ!

**У Віцебску традыцыйную кітайскую медыцыну і найноўшыя распрацоўкі для аздараўлення ўжо выпрабавалі на сабе тысячы гараджан і так званых медыцынскіх турыстаў. Карэспандэнт «Звязды» праверыў уздзеянне таго, чым кітайцы лечаць тысячагоддзямі.**



Біяэнергетычны масаж.

## Супрацоўніцтва на ўзроўні ВНУ

У абласным цэнтры па кітайскую медыцыну стала магчыма звяртацца, улічваючы многія акалічнасці. Па-першае, кафедра захавання здароўя Віцебскага ордэна Дружбы народаў дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта актыўна супрацоўнічае з карпарацыяй Fohow (у перакладзе з кітайскай — «фенікс»).

Па-другое, у Віцебску ў рамках міжнароднага супрацоўніцтва можна наведваць цэнтр славянска-кітайскіх практык «Здрава Ян Шэн».

Дарэчы, ён быў заснаваны ў выніку падпісання дамовы аб супрацоўніцтве паміж факультэтам захавання здароўя Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта і навукова-інавацыйным унітарным прадпрыемствам Fohow.

У Віцебску яшчэ з пачатку 1990-х гадоў пачалі выкарыстоўваць традыцыйную славянскую медыцыну. Псіхолаг Ліёна Футчык першая ў Беларусі арганізавала недзяржаўны натурапатычны аздараўленчы цэнтр. Там можна было аздаравіцца, не выязджаючы з горада, прычым траўкамі: прайшоўшы працэдуры араматэрапіі, фітатэрапіі. Папулярным адразу стала гразелячэнне: торфам і сапрапелем, вялікімі запасамі якіх славіцца Віцебшчына.

Таму кітайцы і ўзялі ўдзел у стварэнні менавіта на Віцебшчыне цэнтра, дзе ахвотныя змогуць упэўніцца ў эфектыўнасці традыцыйных беларускай і кітайскай медыцыны.

## Як дзеці...

Пра Тай Цзі Цыгун — гімнастыку, якая вельмі карысная для аздараўлення і прафілактыкі хвароб, напэўна, чулі многія. Яшчэ гэта — філасофія, практыкуючы якую, чалавек атрымлівае магчымасць не толькі прывесці ў парадак цела, але і наладзіць свой эмацыянальны фон.

Ліёна Футчык, дырэктар навукова-інавацыйнага ўнітарнага прадпрыемства Fohow прапанавала паспрабаваць разам заняцца гімнастыкай. Дарэчы, яна, на мой погляд, ідэальна падыдзе тым, хто нават зарадку рабіць не любіць. Ніякіх вялікіх фізічных нагрузак, цыклы практыкаванняў няцяжкія. У выніку правільна пастаўленага дыхання лёгкія насычаюцца кіслародам і ачышчаюцца. Як курыльшчык з больш чым 30-гадовым стажам адчуў гэта вельмі хутка.

Асабліва спадабаліся рухі нагамі — практыка даоскіх манахаў. Гэта нейк нагадвае першыя крокі дзіцяці. І махаць рукамі было здорава! Менавіта так робяць малыя, калі ім няма чаго рабіць або яны ў чаканні. Заўважце, гэта насамрэч так.

Эфект ад Тай Цзі Цыгун для мяне быў вельмі добры. Цела расслабілася, прыйшло адчуванне даўно забытага душэўнага камфорту.

Мая "гуру" расказала, што кітайскія майстры вучылі гімнастыцы віцебскіх медыкаў. А сеансы з удзелам усіх ахвотных былі вельмі папулярныя падчас прэзентацый у сценах «альма матар».

## Масаж... каменны

На дзесяць балаў ацэньваю і экспрэс-практыкум па кропкавым масажы.

Але больш уразіў масаж з выкарыстаннем камення.

Па словах Ліёны Футчык, гэты самы старажытны від аздараўленчага кітайскага масажу, які вылучаецца паслядоўнасцю і глыбінёй уздзеяння на біялагічныя кропкі, называецца гуаша.

Дарэчы, майстры гуаша робяць яго спецыяльнымі пласцінамі, ад раздражнення якімі па тканках і органах праходзіць магутны аднаўленчы рэфлекторны імпульс.

Для масажу гуаша выкарыстоўваюцца скрабкі разнастайнай формы — плоскія пласціны і лыжкі без тонкіх вострых краёў. Прылада можа мець круглявы выгнуты край той ці іншай ступені крывізны, два-тры буйныя выступы або мноства зубцоў. Важна, каб не было вострых краёў, а пры ўздзеянні на скуру аказваўся ціск, але не з'яўляліся драпіны.

Некаторыя скрабкі вырабляюцца з каменю: нефрыту, агату, яшмы.

Спадарыня Футчык, калі рабіла масаж, паралельна агучвала праблемныя ўчасткі майго цела.

Далей было таксама цікава і карысна. У спіну мне пачалі ўтыкаць нешта гумавае, што нагадвае па форме грушы. Унутры — магніты. Цяжка апісаць, што адчуваў...

Цікава, што маніпуляцыі на спіне мне рабілі ў рукавіцах, зробленых з выкарыстаннем сярэбраных нітак.

Калі шчыра, спачатку доўгі час нічога не адчуваў. Нават крыху расчараваўся, але, калі расказалі аб мерыдыянах Цзынь — Ла май, многае зразумеў.

## «Абнуліў» сябе сам

Наогул высветлілася, што я, як чалавек эмацыянальны, які дзеліцца энергіяй, не ўмею правільна яе пакідаць для сябе. Таму ў энергетычным плане я сябе «абнуліў». Хвілін праз дзесяць раптам я адчуў непрыемнае паколванне. Далей — яшчэ больш... Але потым азнаямленне з працэдурай стала не пакутамі, а задавальненнем. Але, каб адчуць сапраўдны аздараўленчы эфект, спатрэбіцца не адзін сеанс.

Цікавай аказалася і дыягностыка па пульсе. Пасля ўсяго мне прапанавалі праверыць стан майго здароўя з дапамогай унікальнага прыбора.

Пасля таго як скончыліся выпрабаванні на сабе традыцыйнай кітайскай медыцыны, адчуў сябе добра. Між іншым, асобна раю аналагічнае мужчынам. Бадзёрасцю ў выніку энергетычнага «зараду» будуць задаволеныя вашы каханыя жанчыны.

Журналісты не любяць лячыцца, бо графік працы непрадказальны: прэс-канферэнцыі, сустрэчы з героямі артыкулаў, рэпартажы, і нярэдка апошнія падчас камандзіровак, і гэтак далей. Таму прыемна, што выдаўся рэдкі выпадак сумясціць прыемнае з карысным.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Краіна здароўя

# СТАРОЕ — ЯК МАЛОЕ

## Жыццё з дэменцыяй можна аблегчыць



**Пра дэменцыю, ці старэчую слабасць розуму, шырока гаварыць не прынята. Тым часам кожныя тры секунды на планеце ўрачы ставяць такі дыягназ. Яны ж прагназуюць, што ўжо праз тры дзесяцігоддзі колькасць хворых патроіцца. Не выключана, што сярод іх будзем і мы з вамі. Дэменцыя небяспечная тым, што варта прапусціць «першыя сігналы», і хвароба цалкам «з'ядае» чалавека за 3—5 гадоў. Як яе распазнаць і замарудзіць, расказала ўрач-псіхіятр-нарколаг Гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера г. Мінска Надзея ТРАЦКЕВІЧ.**

— Колькасць пажылых людзей у нашай краіне з кожным годам расце. Ужо сёння кожны пяты жыхар Беларусі — чалавек ва ўзросце 60 гадоў і больш. З кожным годам працэнтныя суадносіны павялічваюцца ў бок старасці. Таму і захворванні, якія сустракаюцца ў пажылым узросце, у тым ліку і старэчая дэменцыя, набываюць актуальнасць у медыцыне, — канстатуе Надзея Станіслаўна.

Нярэдка мы сутыкаемся з тым, што нашы блізкія ці сябры і знаёмыя становяцца самі на сябе непадобныя. Іх паводзіны моцна мяняюцца: з'яўляецца неабгрунтаваная плаксівасць і раздражнёнасць, яны блытаюцца ў датах і падзеях, што адбыліся зусім нядаўна, забываюць імёны сваякоў, задаюць адны і тыя ж пытанні праз непрацяглы прамежак часу, імкнуцца ўстаць з ложка, хоць ужо працяглы час прыкаваныя да яго пасля інсульту, імкнуцца ісці туды, дзе жылі ў маладосці, пакідаюць уключанымі газ, святло ці ваду. Усё гэта адбываецца не па іх жаданні і не па прычыне характару, а ў сувязі са значнымі кагнітыўнымі (пазнавальнымі) парушэннямі — пагаршэннем памяці і аслабленнем інтэлекту, таму бессэнсоўна на іх сварыцца, вінавац磁. Наадварот, трэба набрацца цярпення і прыняць тое, што ў вашага блізкага — дэменцыя (старэчая слабасць розуму), раіць спецыяліст.

Дэменцыя пажылога ўзросту можа развіцца пасля 65 гадоў на фоне артэрыяльнай гіпертэнзіі, аднаразовага ці шматразовых інсультаў, пры хваробе Альцгеймера ці пры хваробе Паркінсона. Гэтыя прычыны найбольш часта сустракаюцца, а хвароба носіць незваротны і прагрэсуючы характар. Гэта сведчыць аб тым, што на працягу астатняга жыцця ў чалавека ў залежнасці ад тэмпу прагрэсавання хваробы будзе пагаршацца памяць. Прычым яе парушэнне пачынаецца з цяперашніх падзей, потым з памяці знікаюць нядаўнія і затым — аддаленыя падзеі. Навыкі, набытыя на працягу жыцця, зніжаюцца па такім жа прынцыпе. Чалавека ў такім выпадку можна параўнаць з дзіцем, якое паступова нечаму вучыцца: сядзець, стаяць, хадзіць, гаварыць, чытаць і інш. У пажылога чалавека навыкі паступова знікаюць у адваротным кірунку. Менавіта таму такім пацыентам неабходны догляд і дапамога з боку родных. Ведаючы гэта і валодаючы пэўным цярпеннем, можна палепшыць якасць жыцця пажылых людзей, якія пакутуюць на дэменцыю.

Варта ўлічваць, што існуюць лекавыя прэпараты, якія памяншаюць выяўленасць сімптомаў хваробы, а таксама зніжаюць тэмп яе прагрэсавання. На жаль, паляпшэнні назіраюцца толькі пры дастатковa працяглым прыёме прэпаратаў. У Беларусі гэта група прадстаўлена прэпаратам данепезіл (алзепіл). Вельмі важна ўстанавіць для пацыента пэўны рэжым дня, які прыняce ўпарадкаванасць у яго жыццё (прабуджэнне, водныя працэдуры, снеданак, прагулка ў пэўны час і інш.).

Вакол такіх хворых трэба стварыць бяспеку, каб пазбегнуць траўматычных сітуацый. Зачыняць балкон так, каб адчыніць яго маглі толькі вы, хаваць колючыя і рэжучыя прадметы, перакрываць падачу газу і вады, калі вы сыходзіце. Лекавыя прэпараты павінны быць у недаступным месцы. Нельга займацца зменамі ў інтэр'еры, у прыватнасці перастаўляць мэблю, бо часта гэта суправаджаецца стрэсам і прагрэсаваннем хваробы.

Людзям са старэчай дэменцыяй пажадана даваць якія-небудзь заданні, якія могуць унесці сэнс у іх жыццё, але пры гэтым важна ўлічваць, ці зможа чалавек выканаць гэтыя заданні і давесці іх да лагічнага канца. Паспяховае іх выкананне надае пачуццё значнасці і ўласнай годнасці. Такая занятасць і дакладны распарадак дня не дазволяць хвораму спаць днём, а ўначы быць актыўным.

— Блізкія людзі могуць значна аблегчыць пакуты, выратаваць ад страху перад невядомым светам, аказаць дапамогу ў доглядзе тым, хто мае ў гэтым патрэбу, — кажа Надзея Трацкевіч. — Калі ў вас узніклі здагадкі аб наяўнасці хваробы ў сваякоў, не варта адкладваць наведванне псіхіятра, неабходна як мага раней пракансультавацца. Пры ранняй дыягностыцы парушэнняў вы зможаце палепшыць якасць жыцця блізкага вам чалавека.

### ПРЫКМЕТЫ ДЭМЕНЦЫІ

- Неахайнасць. Гара бруднага посуду, перапоўненае вядро са смеццем, непрыдатнае адзенне і іншыя прыкметы страты цікавасці да быту.
- Чалавек вельмі добра памятае былое, дні юнацтва, першае каханне, але зусім не памятае, што еў сёння на сняданак.
- У доме з'яўляюцца дзіўныя прадметы, непатрэбны хлам, якога не было раней.
- Страта паўсядзённых навыкаў. Напрыклад, варта змяніць паўсядзённы маршрут ад паліклінікі да дома, і чалавек губляецца.
- Страта прафесійнай памяці, асабліва ў людзей, у якіх праца была звязана з разумовай дзейнасцю.

# Што ўплывае на рост і разумовае развіццё дзяцей?

**Ці ведаеце вы, што менавіта шчытападобная залоза забяспечвае рост і развіццё дзіцяці, фізічную і разумовую працаздольнасць і іншыя важныя функцыі арганізма? Гэта менавіта так. Свой уплыў шчытападобная залоза аказвае, выдзяляючы ў кроў адпаведныя гармоны, складнікам якіх з'яўляецца ёд, а таксама бялок.**

— У некаторых рэгіёнах нашай краіны — да іх адносіцца, напрыклад, Палессе — у глебе, а значыць, і ў прадуктах харчавання ёду не хапае. У часткі людзей гэта вядзе да павелічэння (гіперплазіі) шчытападобнай залозы рознай ступені: такім чынам арганізм імкнецца папоўніць недахоп ёду, — кажа **ўрач-рэабілітолаг 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі г. Мінска Любоў ЛОНСКАЯ.** — Павелічэнне шчытападобнай залозы, пачынаючы з трэцяй ступені і больш, называецца валлякам. У Беларусі гэта захворванне сустракаецца часта, таму кажуць пра эндэмію валляка. Асабліва ён небяспечны ў дзіцячым узросце, бо можа прывесці да затрымкі росту, да адставання ў фізічным і разумовым развіцці.

**Таму варта ведаць, што:**

- Ёду больш за ўсё змяшчаецца ў марской капусце, марской рыбе, кальмарах, яйках, аўсяных, прасяных, грэцкіх крупах, у гароху, сыры, малочна-кіслых прадуктах, арэхах (кедровых, грэцкіх, арахісавых), радысцы, рэдзьцы, моркве.
- Кобальту больш за ўсё ў печані, рыбе, агародніне (моркве, бураках, зялёнай цыбулі, перцы, часнаку), у зеляніне (шчаўі, кропе, крапіве), журавінах, рабіне, чорных парэчках, арэхах, бабах, фасолі.
- Асноўныя крыніцы марганцу — збожжавыя і прадукты іх перапрацоўкі.
- Больш за ўсё вітаміну С у садавіне, соках, зеляніне.
- Мяса, рыба, бабовыя — асноўная крыніца бялку.

Выкарыстоўваць гэтыя прадукты можна як для прыгатавання першых і другіх страў, так і для салатаў, вінегрэту, ужываць у свежым выглядзе. Акрамя таго, для прыгатавання ежы варта выкарыстоўваць ёдаваную соль. Дадаваць яе трэба ў канцы варкі, не дапускаць бурнага кіпення, прадукты варыць з закрытай накрыўкай, бо падчас кіпення ёд выпарваецца.

# ПРАБЛЕМНЫ ВУЗЕЛ

## Чаму ўзнікае міёма маткі і ці патрэбна аперацыя?



**Міёма маткі — адно з самых распаўсюджаных гінекалагічных захворванняў, якое сустракаецца як мінімум у трэці жанчын, старэйшых за 35 гадоў, а пасля 40 — амаль у кожнай другой. Такі дыягназ пужае і выклікае ў пацыентак шмат пытанняў. Частку з іх мы задалі акушэру-гінеколагу 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска, клінічнаму ардынатару кафедры акушэрства, гінекалогіі і рэпрадуктыўнага здароўя Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Святлане КРЭЕР.**

***— Святлана Аляксандраўна, што такое міёма маткі?***

— Дабраякасная пухліна, якая развіваецца з гладкамышачнай і злучальнай тканкі маткі. Гэта самае распаўсюджанае новаўтварэнне, якое займае першае месца ў структуры ўсіх пухлін палавых органаў у жанчын. Найбольш часта яе дыягнастуюць ва ўзросце 35—55 гадоў. У жанчын, старэйшых за 30 гадоў, распаўсюджанасць складае 20—30 %, у старэйшых за 40 гадоў — 40 %.

***— З-за чаго яна ўзнікае?***

— Апошнім часам значна змяніліся і пашырыліся ўяўленні аб прычынах узнікнення і росту міёмы маткі. Існуе некалькі тэорый. Першая з іх — спадчынная, якая разглядае міёму як генетычна абумоўленае захворванне. У блізкіх сваячак хворых міёма маткі сустракаецца ў 2-3 разы часцей, чым у папуляцыі. Ужо знойдзены мутацыі генаў HMGI(С) і HMGI(Y), якія ў норме кадзіруюць бялкі, адказныя за перанос генетычнай інфармацыі. Другая — запаленчая тэорыя. Запаленне, справакаванае інфекцыяй, вядзе часам да паталагічнага аднаўлення тканак і фарміравання зачатках вузлоў міёмы. Трэцяя — імуналагічная тэорыя, дзе ключавую ролю адыгрывае імунная сістэма. І апошняя — гарманальная тэорыя.

***— Гармоны ўплываюць на далейшы рост міёмы?***

— Няма сумненняў, што палавыя гармоны рэгулююць рост міёмы маткі. У параўнанні з навакольнымі тканкамі ў міяматозных вузлах змяшчаецца ў два разы больш эстрагенных рэцэптараў, а прагестэронавых — у тры разы. Адпаведна, абедзве групы жаночых палавых гармонаў могуць істотна ўплываць на рост сфарміраваных міяматозных вузлоў.

***— Як жанчына можа адчуць, што ў яе міёма?***

— Клінічная карціна гэтага захворвання разнастайная, залежыць ад размяшчэння вузла, тэмпаў росту, спалучэння міёмы маткі з іншымі паталогіямі. Нярэдка захворванне мае бессімптомны характар і з'яўляецца «знаходкай» падчас ультрагукавога абследавання. Жанчыну могуць непакоіць парушэнні менструальнага цыкла (мастачныя крывацёкі), доўгія і інтэнсіўныя месячныя, перыядычныя ці пастаянныя болі ўнізе жывата ці ў вобласці паясніцы, парушэнні функцыі суседніх органаў. Калі міёма размяшчаецца ў вобласці пярэдняй сценкі маткі, адбываецца сцісканне мачавога пухіра і расстройства мочаспускання. Калі міёма размяшчаецца па задняй сценцы маткі, жанчына можа скардзіцца на гемарой і хранічныя запоры.

***— Як дыягнастуюць і лечаць міёму?***

— У сучасных умовах зрабіць гэта проста. Клінічныя прыкметы, скаргі, агляд гінеколага, ультрагукавое даследаванне органаў малога таза — асноўныя метады. Дадатковыя — магнітарэзанансная тамаграфія і гістэраскапія.

Сярод сучасных тэндэнцый у лячэнні — органазахавальныя аперацыі, укараненне малаінвазійных тэхналогій. Медыкаментознае (гарманальнае) лячэнне скіравана на тармажэнне росту пухліны, змяншэнне памераў вузлоў, захаванне рэпрадуктыўнай функцыі, паляпшэнне якасці жыцця. Хірургічнае лячэнне прымяняецца пры міёме вялікіх памераў, субмукознай міёме, сімптоме сціскання суседніх органаў, хуткім росце міёмы, вострым парушэнні сілкавання вузла, міёме, якая праяўляецца працяглымі і інтэнсіўнымі месячнымі, якія вядуць да анеміі.

***— Як можна папярэдзіць гэту хваробу?***

— Здароўе кожнага з нас прыкладна на пяцьдзясят працэнтаў залежыць ад ладу жыцця. Таму важна найперш правільна харчавацца, павялічыць у сваім рацыёне колькасць прадуктаў, багатых на ненасычаныя тлустыя кіслоты. Старацца нармалізаваць вагу пры атлусценні. Пры наяўнасці міём у блізкіх сваячак супрацьпаказаныя празмерны загар, цеплавыя працэдуры. Пазбягаць інфекцый, абортаў, інвазійных умяшанняў. І абавязкова прыходзіць на прыём да гінеколага раз на год, а таксама з такой жа перыядычнасцю рабіць ультрагукавую дыягностыку органаў малога таза.

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

# «ВЕЗЛА СУМКІ, ЯК ПАДНЯЦЬ, — СУСТРАКАЎ З ВАГОНА ЗЯЦЬ...»

**Што праўда, то праўда: самае вялікае дасягненне «Звязды» — гэта яе чытачы. Ну, мяркуйце самі: неяк напрадвесні ў газеце кароткая нататка выйшла — пад загалоўкам «Хутка заб'юць фантаны». І што вы думаеце — тут жа ў пошце пытанні: а чым, уласна, заб'юць? Вадой?.. Нейкімі драўлянымі затычкамі? Ці наогул гарадскія ўлады возьмуць і, так бы мовіць, «заб'юць» на тыя фантаны — зоймуцца, напрыклад, дарогамі ці паркоўкамі...**
**І гэта — звярніце ўвагу — быў толькі загаловачак, тры слоўцы... Што ўжо казаць пра здымак, дзе столькі ўсяго?..**
**Подпіс трэба прыдумаць? Ды хоць сто штук!**



Друкуем, як заўжды, найлепшыя. Такім чынам:

*Да сябе фантан заве? —*
*Кроў дэсанцкая ў жылах!*
*Значыць, цётка — у ПДВ,*
*Хай на кухні, ды служыла!*

Мяркуе так **спадар Мікола Кісель з Мінска.**

Падобныя думкі і ў **спадарыні Іны Алісевіч з Уздзеншчыны.**

*Мы праверым на сабе*
*Завядзёнкі ПДВ.*
*І з найлепшае пачнём:*
*Ля фантана адпачнём...*
*Калі сэрца прагне свята,*
*Не бяда, што мелкаваты.*

І сапраўды: галоўнае, што ён — забіў: вада — ёсць і ёй можна карыстацца, бо часам (паводле назіранняў **спадарыні Соф'і Кусянковай з Рагачоўшчыны**)

*У вёсцы з крана*
*бруд бяжыць —*
*Ні памыцца, ні папіць,*
*Таму ў горад едзе Таня*
*Асвяжыцца ў фантане.*

Далекавата? Але ж...

«Здымак нагадаў мне, як малым хадзіў у касцёл, — піша **спадар Іван Сіманёнак з Паставаў.** — Каб скараціць дарогу, мы з бабуляй Сабінай ішлі нацянькі — лесам, балотам, прычым басанож, а потым, на падыходзе, у возеры, абмывалі ногі, абувалі чаравікі».

Нешта падобнае ўбачыў чытач і на здымку: бабуля яўна вясковая, больш прывычная да іншага абутку. А тут (ці не патураючы гарадскому ўнуку?) прыбралася — на сваю галаву:

*Зручныя гумовічкі,*
*Сельскія дарогі...*
*Па асфальце ў новенькім?*
*Мазалямі ногі!*
*Ды вада — жывая*
*(Што няўцям малому):*
*Ёй заўжды змывалі*
*Крыўду, боль і стому.*

Што праўда, то праўда. Піша пра яе і **спадарыня Любоў Чыгрынава з Мінска:**

*Забіралі з вёскі Дуню*
*І на сметнік яе чуні,*
*Следам боты ды сандалі...*
*Туфлі новыя прыдбалі.*
*Дуня ведае цяпер:*
*Замаленькі быў памер.*
*Ногі сцерла да крыві,*
*Хоць на свеце не жыві...*
*Таму знайце, гараджане:*
*Дуня... лечыцца ў фантане.*

І, зазначым, не толькі целам. «Мая знаёмая расказвала, — прыгадвае **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў,** — як некалі, за савецкім часам, трапіла ў Маскву на Усесаюзную выстаўку дасягненняў народнай гаспадаркі, як вырашыла абысці ўсе без выключэння павільёны. А іх жа там — без ліку, можна сказаць... Карацей, у другой палоўцы дня жанчына ледзь ног перастаўляла. А побач — фантаны, вада бруіць... Вось яна і не стрымалася: туфлі скінула і, як гэта цётка са здымка, ногі ў ваду... Казала — быццам у родную вёску трапіла — каля сажалкі сядзіць, што ў канцы гарода...»

Зайздросны быў адпачынак! Ці не так? А ўжо які патрэбны, калі

*Унук у цёткі — што ўраган:*
*Збіла за ім пяты:*
*Зараз ногі — што ў фантан,*
*Што ў ставок ля хаты.*

А ўсё таму (згадзіцеся з **Карынай Цанунінай, сямікласніцай СШ № 3 г. Вілейкі**), што

*Вада прывабіць у любым*
*узросце,*
*Яна — крыніца нашага жыцця.*
*Перад вачыма прыклад*
*самы просты:*
*Жанчына ля фантана і дзіця.*
*Малому пырскі падымаць*
*прыемна,*
*Бо так гуляюць дзеці*
*ўсёй зямлі,*
*Бабуля ж, каб не траціць час*
*дарэмна,*
*«Размочвае» ў фантане*
*мазалі.*

А потым...

Што будзе (ці можа быць...) ведае **спадарыня Іна Алісевіч:**

*У хлапца бабуля — супер!*
*Кажа ўсім: «Какие годы?»*
*Загарэўся б нават Купер*
*Апісаць яе прыгоды!*
*Вось і сёння ў паходзе:*
*Заапарк, атракцыёны...*
*Хто з іх першы скажа: «Годзе!»*
*Пажылая ці «зялёны»?*

А найлепш бы — на думку **спадарыні Чыгрынавай —** разам, бо:

*Сын з нявесткай —*
*шусь на мора,*
*А бабулі — страх і гора:*
*Зранку бегае ўгрунь,*
*Бо ўнук — што той уюн...*
*Але ж нешта во прыціх?*
*Таму зараз для дваіх*
*Адпачынак ля фантана*
*Лепей мора-акіяна!*

Можна прыкінуць, чым (канкрэтна) ён лепшы: не трэба візы афармляць, далёка ляцець ці ехаць, грошы плаціць... І сапраўды — дзеля чаго, калі і тут (паводле **спадарыні Валянціны Гудачковай з Жыткавічаў**)

*Ёсць фантан, хоць неглыбокі?*
*То ўратуемся ад спёкі:*
*Як сцямнее, у вадзіцы*
*Можна будзе й агаліцца!*

Ну, сапраўды: не адным жа дэсантнікам? І сваім ню людзей прывабіць?.. Альбо распужаць?

А заадно, можа, і грошай сэканоміць, бо «тарыфы на ваду цяпер такія, — піша **спадарыня Наталля Шкут са Светлагоршчыны,** — што да фантанаў не толькі ногі, але хутка і бялізну пойдзем мыць...» Праўда, гэта — яшчэ не самае страшнае:

*Калі не стане раптам газу,*
*Распалім вогнішча адразу.*
*Калі вады не будзе ў кране,*
*Памыем ногі ў фантане.*
*Калі ж святла, крый бог,*
*не будзе,*
*Павыміраюць, мусіць,*
*людзі,*
*Счарнее, згіне белы свет,*
*Бо не ўключыш... інтэрнэт.*

Без яго, і сапраўды, як без рук. Ці без грошай... Адзін хлопчык, казалі, кінуў манетку ў фантан: прыкмета ёсць — каб вярнуцца... І ён вярнуўся, бо... не хапіла грошай на аўтобус.

На што не хапіла жанчыне?

Хтосьці можа сказаць, што ім заўжды не хапае... У **спадара Віктара Сабалеўскага з Узды** свой погляд:

*Галя — не злачынца,*
*Галя — не зладзейка.*
*Маці навучыла*
*Берагчы капейку.*
*Тут жа тых капеек*
*Столькі накідалі...*
*Хопіць павячэраць —*
*І не раз — для Галі!*

Яна — незамужняя, трэба разумець, сама за вячэры плаціць, можа, нават аб'явы часам дае накшталт: «Выйду замуж. Ем мала, гавару ціха, галава не баліць»... І потым чакае званкоў. А трэба (на думку **спадара Івана Астроўскага з Мінска**), як вось гэтая Галя (са здымка) дзейнічаць:

*Для жанчын незакаханых*
*Я параду даць гатоў:*
*Мыйце ногі ў фантанах,*
*Каб прываблць жаніхоў.*
*Гэта стане ім падмогай,*
*Бо мужчын цікавяць ногі.*
*Хтосьці «клюне», і тады...*
*Ёсць... падпісчык у «Звязды»!*

А чаму б і не, калі знаёмства адбылося менавіта з яе «падачы», калі адшукалася палавінка (хто казаў, што людзі, як шкарпэткі: усе падобныя, а пару — не знайсці?), калі стварылася ўсё ж сям'я...

**Спадар Валерый Гаўрыш** убачыў на здымку якраз яе — і ў поўным складзе, можна сказаць: на заднім плане на лавачцы сядзіць зяць, на пярэднім — яго сын і цешча, прычым немаладая ўжо:

*Везла сумкі, як падняць?*
*Сустракаў з вагона зяць.*
*Дома ванну рыхтаваў*
*Торцік з чаем падаваў...*
*Дзе падзеўся той імпэт,*
*Як пры ёй пусты пакет?*

Знік, трэба разумець, бо...

Любіць зяць узяць — чым больш, тым лепш і нашармачка. Хоць бываюць і адхіленні. Той жа **спадар Гаўрыш** паміж вось гэткім зяцем і цешчай размову падслухаў:

*— Ой ты ж, мамачка мая,*
*Мыў бы ногі табе я,*
*Каб даведаўся, калі*
*Ты мне справіш «жыгулі»!*
*— Даражэнечкі мой зяць,*
*Дзе ж на іх мне грошы*
*ўзяць?*
*Сам старайся —*
*зарабляй*
*І хоць «лексусы» купляй!*

Можа, і прыслухаецца чалавек да гэтай парады, а можа...

У пошце два варыянты развіцця падзей. Паводле **спадарыні Любові Чыгрынавай:**

*Бізнесоўцы — каста новая*
*І пыхліва-ганаровая...*
*Каб уцерці іншым нос,*
*Палятуць на Барбадос.*
*Не навіна і не дзіва*
*Ім Канары ды Мальдзівы...*
*А бяднейшым — ля фантана*
*І Багамы, і Сантана...*

А тым больш што...

Лірычнае адступленне — ад **спадара Астроўскага:**

*Беларусь — цудоўны край,*
*Тут працуй, адпачывай...*
*Шмат азёраў, шмат фантанаў,*
*Лесу, красак на лугу...*
*Ды народ як апантаны:*
*Хто ў Крым, хто на Балканы...*
*Я ж — нікуды не магу,*
*Бо да сотак прывязаны,*
*Як Барбос на ланцугу.*
*І не мару жыць іначай,*
*Бо мілей за ўсё мне... дача!*

Калі ёсць яна... Бо можа ж і не быць, мяркуе **спадар Сабалеўскі:**

*У вадзе жанчына*
*Нештачка шукае:*
*«Дзе ж ты мая,*
*дзе ты,*
*Рыбка залатая?!*
*Для сябе палацы*
*Я прасіць не буду.*
*Муж не мае працы,*
*Дай яму хоць вуду...»*

І яшчэ адна просьба-мара — ад **спадарыні Гудачковай:**

*У фантан слязу раняю —*
*Успамінаю мілага:*
*Пяты дзень не прасыхае,*
*Аж жыццё нямілае!*

...Такім чынам і з дапамогай **спадарыні Ніны Бурко з Бярэзіншчыны** «падбіваем бабкі»:

*Не зайздросціць аніхто*
*Сённяшняй жанчыне:*
*Толькі і ведай, што рабі,*
*Як тая рабыня...*
*Праменад ды манікюр*
*Многім толькі сніцца.*
*Ім даступна перш за ўсё*
*Чыстая вадзіца.*

Менавіта ў ёй і ёсць паратунак: калі што якое — збрыдзее безграшоўе, цяжкая праца, дзеткі-ўнукі, пітушчы муж ды інш. — можна будзе (з падачы **спадарыні Гудачковай**) «забіць» на ўсё, сказаць:

*Ну й дастаў мяне абутак!*
*Ногі сталі — нібы скрутак...*
*Акуну іх у ваду,*
*Далей босая пайду!*

І дай бог далёка!..

Завяршыць жа сённяшні агляд хочацца кранальнымі радкамі, якія напісаў да здымка **спадар Мікалай Старых з Гомеля:**

*Маруся малую радзіму*
*ўзгадала,*
*Дзе басанож па мураўцы*
*гуляла,*
*Успомніла поле, лугі і дубровы,*
*Яблыкаў спеленькіх колер*
*барвовы.*
*І так захацелася па беражочку*
*Ў ціхай рачулцы памыць*
*свае ножкі...*
*Да роднага дома шлях доўгі*
*ляжыць.*
*А ногі ў фантане можна*
*абмыць.*

Аніхто ў Маскве не прычапіўся з-за гэтага да нашай зямлячкі, не прычэпіцца, дасць бог, і дома, бо недурны нехта прызнаў, што, каб заўсёды быць маладым, трэба як мага часцей глядзець на зялёную траву, на бягучую ваду і прыгожых жанчын, пажадана — у натуры, за межамі гарадоў.

Таму ж, хто не мае гэткай магчымасці, дарэчы будуць фантаны і паркі ці нават... старонкі «Звязды», дзе з падачы нашых фотакарэспандэнтаў б'юць крыніцы, цвітуць кветкі, працуюць, гадуюць дзетак мясцовыя харашухі.

Пра іх — і досыць часта — нашы чытачы складаюць вершы.

Вось і мінулы раз (гл. артыкул «Мужчыны ў нас — на пералік, вось і шануем іх без меры...» «Звязда» ад 5 верасня г. г.) чаго толькі не прыдумалі! Цяжка выбраць найлепшае! Але...

Вялікае чытацкае журы прызнала такім радкі **спадароў Валерыя Гаўрыша з Чавусаў, Віктара Сабалеўскага з Узды, Міколы Кісяля з Мінска, спадарынь Іны Алісевіч з Уздзеншчыны, Валянціны Гудачковай з Жыткавічаў, Соф'і Кусянковай з Рагачоўшчыны і Любові Чыгрынавай з Мінска.**

З гэтым вось апошнім меркаваннем пагадзілася і маленькае рэдакцыйнае журы. А значыць, прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам газету «Звязда» на першы квартал 2019 года застаецца ў сталіцы.



Вы таксама хацелі б, каб пяць разоў на тыдзень да вас прыходзіла найстарэйшая, адзіная са штодзённых беларускамоўная і родная на роднай мове?.. Тады ўважліва глядзіце на ніжні здымак, прыдумвайце подпіс, можна некалькі, але дасціпных, прыгожых, кароткіх (не больш за 8 радкоў), і дасылайце ў рэдакцыю. Шанц на выйгрыш ёсць у кожнага! Поспехаў!

**Валянціна ДОЎНАР.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

**Ад іх жа** шчырыя прабачэнні ўсім, чые радкі не прайшлі строгага конкурснага адбору — на гэты раз, а ўжо наступным...

Пішыце: свет захаваўся таму, што смяюцца. І думаў.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 440/С-12972 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – рыночный павильон – 1), общей площадью 91,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская, 135; капитальное строение, инв. № 440/С-12973 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – рыночный павильон – 2), общей площадью 44,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская, 135/1; капитальное строение, инв. № 440/С-12974 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – рыночный павильон – 3), общей площадью 32,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская, 135/2

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 424950100001002618, площадью 0,2097 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли), по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская.

Начальная цена продажи – 180 000 руб. (сто восемьдесят тысяч рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 9000 руб. (девять тысяч рублей).

Продавец – Ошмянский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231103, г. Ошмяны, ул. Советская, 130, тел. 8-01593-76-705.

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38.

Условия аукциона – проведение реконструкции объектов и (или) снос с последующим строительством объекта (-тов) неторгового назначения. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225.

**Аукцион состоится 21 декабря 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 17 декабря 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»*
*http://grodnoino.by*

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 431/С-13564 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – одноэтажное кирпичное здание магазина), общей площадью 191,3 кв. м, расположенное по адресу: Кореличский р-н, г. п. Мир, ул. Красноармейская, 14.

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 423355700001000843, площадью 0,1258 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина) по адресу: Кореличский р-н, г. п. Мир, ул. Красноармейская, 14. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадью 0,0690 га; земельные участки, расположенные в зонах охраны недвижимых материальных историко-культурных ценностей, код – 6, площадью – 0,1258 га.

Начальная цена продажи – 74 317,17 руб. (семьдесят четыре тысячи триста семнадцать рублей семнадцать копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 7 431 руб. (семь тысяч четыреста тридцать один рубль).

Продавец – Кореличский филиал Гроднооблпотребобщества, 231430, г. п. Кореличи, ул. 8 Марта, 28, 8-01596-2-14-84.

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38.

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225.

**Аукцион состоится 7 декабря 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 15.09.2018.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 3 декабря 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»*
*http://grodnoino.by*

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЛОТ 1:** капитальное строение, инв. № 431/С-15477 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – одноэтажное кирпичное здание магазина), общей площадью 683,7 кв. м, расположенное по адресу: Кореличский р-н, г. п. Мир, ул. Красноармейская, 27.

Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 423355700001000942, площадью 0,1603 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина) по адресу: Кореличский р-н, г. п. Мир, ул. Красноармейская, 27. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в зонах охраны недвижимых материальных историко-культурных ценностей, код – 6, площадью – 0,1603 га.

Начальная цена продажи – 19 320 руб. (девятнадцать тысяч триста двадцать рублей) с учетом НДС.

Сумма задатка – 1932 руб. (одна тысяча девятьсот тридцать два рубля).

Продавец – Кореличский филиал Гроднооблпотребобщества, 231430, г. п. Кореличи, ул. 8 Марта, 28, 8-01596-2-14-84.

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38.

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225.

**Аукцион состоится 7 декабря 2018 г. в 12.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 12.04.2018 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 3 декабря 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»*
*http://grodnoino.by*

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению КЖРЭУП «Сельмашевское» (продавец) извещает о проведении 24 декабря 2018 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| ПРИМЕЧАНИЕ: **стоимость имущества реализуется без учета НДС (в соответствии с п.п. 2.3 ст. 93 НК РБ).** Местонахождение имущества: **г. Гомель, пр-т Космонавтов, 15** | | | |
| 1 | **Полуприцеп самосвальный тракторный ПСТ-9 (инв. № 7069) ,** 2010 г. в., **рег. № ЕВ-3 4051**, состояние – требует мелкого ремонта | **3 560,65** | 356,07 |

**Продавец:** КЖРЭУП «Сельмашевское», г. Гомель, пр-т Космонавтов, 15. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (0232) 22-47-07 – Науменко Николай Владимирович. **Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (КЖРЭУП «Сельмашевское»):** р/с BY21 PJCB 3012 4045 4310 0000 0933 в ОАО «Приорбанк» ЦБУ № 400, УНН 400052171, БИК PJCBBY2X, ОКПО 00642495, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 21 ноября 2018 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 20 декабря 2018 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Подача документов по почте не допускается. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения. Для участия в аукционе предоставляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником**, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

| **Извещение о проведении повторного аукциона** | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Искож», Брестская обл., г. Пинск, ул. Брестская, 57 |
| **Предмет аукциона (одним лотом)** – оборудование, расположенное по адресу: Брестская обл., **г. Пинск, ул. Брестская, 57** | |
| Инв. № | Наименование |
| 2490 | **Универсальная линия по производству различных видов столовых клеенок, переплетного материала** (производитель: Forward Machinery Industrial Corporation (Тайвань, Китай) |
| 2377 | **Технологическая линия для производства ПВХ-пленок различного назначения** (производитель: Wuxi Double Elephant Rubber & Plastics Machinery Co., Ltd (Китай) |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 5 340 736,95 бел. руб.** (снижена на 20 %) | |
| **Обременение** | Находятся в залоге у ОАО «Банк БелВЭБ» |
| **Условия аукциона** | Покупателю предоставляется право на заключение договора аренды площадей, на которых располагается оборудование, либо выкупа площадей, либо демонтаж линий за свой счет |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001** в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390 | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от **18.08.2018** | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **05.12.2018** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **04.12.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by** |

Кінакрокі

# СПРАВА АБ ВАСЯМНАЦЦАЦІ

## Нацыянальны конкурс «Лістапада» здае пазіцыі

**Нацыянальны конкурс міжнароднага кінафестывалю «Лістапад» ужо каторы год быццам збірае для гледачоў найлепшае, што было створана беларускімі аўтарамі ўнутры краіны ці за яе межамі. У гэтым годзе да паўнаты карціны ўзніклі пытанні: куртатая праграма, пазбаўленая некалькіх работ — спачатку праз умяшанне Міністэрства культуры, потым праз рэакцыю фільммэйкераў, — умясціла ў сябе 18 фільмаў. З той нагоды, што мы ўжо неяк прызвычаіліся ацэньваць, ёсць у айчыннага кінематографа надзея ці не, менавіта па праграме Нацыянальнага конкурсу, сёлета засталіся са змешанымі пачуццямі. Ці то надзеі няма, ці то яна недзе хаваецца. Прынамсі, самай прыемнай і роўна пазітыўнай часткай аказалася анімацыя, а што з астатнім беларускім кіно — лепш, напэўна, не думаць.**

### У КАНТЭКСЦЕ

Нацыянальны конкурс і ў мінулыя гады агаляў няспеласць альбо нават застой беларускага кінематографа. Прадукт «манапаліста» Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» па вядомых прычынах (з-за сумнiўнай якасці) нават з усімі бюджэтнымі грашыма трапляў у яго рэдка (калі не браць у разлік анімацыю). Незалежныя аўтары, здымаючы за свой кошт, прапаноўвалі ў асноўным першыя крокі і кароткі метр — затое па іх разнастайнасці можна было ўбачыць кірунак думак і сферу інтарэсаў.

Адзінкавыя моцныя аўтары выдзяляліся з праграмы, але станавіліся выключэннем, да таго ж выяўлялі, у гэтым годзе таксама, шматзначную і, напэўна, вельмі сумную тэндэнцыю: часта вартыя ўвагі работы прапаноўвалі беларусы, што вучацца, жывуць, працуюць за мяжой.

Але праз конкурс быў відаць нейкі «дзвіж», рухі, развіццё, прысутнасць моцных аўтараў, жаданне маладых людзей карыстацца тэхналогіямі і праз спрашчэнне працэсу стварэння кіно быць да яго датычнымі.

Сёлета Нацыянальны конкурс аказаўся расчаравальным. Па-першае, з-за самой праграмы, якая для мяне прасігналізавала аб стагнацыі айчыннага кінематографа (хоць трэба прызнаць, дакументальная частка была пазбаўлена такіх работ, з якімі вобраз Нацконкурсу выглядаў бы больш станоўчым). Па-другое, з-за скандалу, што разгарнуўся вакол таго, што Міністэрства культуры вырашыла апошняе слова аб складзе праграмы пакідаць за сабой без удзелу прадстаўнікоў дырэкцыі кінафестывалю. Пахіснуўся вобраз надзейнай пляцоўкі, якой дагэтуль уяўляўся Нацыянальны конкурс «Лістапада». Але нешта вартае на вялікі экран усё ж трапіла.

### ДАКУМЕНТАЛІСТЫКА

У працяг тэмы сумных тэндэнцый: найлепшым фільмам дакументальнай часткі конкурсу нацыянальнага кіно становіцца работа беларуса, што жыве ў Расіі. Руслан Фядотаў з'яўляецца адным з аўтараў любімай намі «Саламанкі» пра абшчыну менанітаў у Мексіцы, якая ў свой час атрымала ўзнагароду «Лістапада» і іншых фестываляў. Гэтым разам ён выступіў са сваёй работай «Песні для Кіта» пра бяздомную і вельмі непасрэдную жанчыну, што любіць плюшавыя цацкі, можа пралезці праз агароджу і пафарбаваць валасы ў грамадскай прыбіральні. Карціна, знятая пад уздзеяннем школы Марыны Разбежкінай, прапанавала гледачам сапраўдную жывую дакументалістыку, што вызначаецца і фактурай, і спосабам здымкі.

Цікава, як бы размеркаваліся ўзнагароды, калі б Нацыянальны конкурс не страціў важных дакументальных «байцоў», бо ў такім выпадку канкурэнты ў Руслана Фядотава былі б няпростыя.



Кадр з фільма «Песні для Кіта».

Можна па інерцыі вылучыць работу знанага беларускага дакументаліста Галіны Адамовіч «Нашы дзеці» пра бацькоў, у тым ліку актрысу Ганну Хітрык, што выхоўваюць «незвычайных» дзяцей. Але трэба прызнаць, што высакароднасць тэмы і прафесіяналізм тут перакрываюць мастацтва, а фільм у выніку становіцца сацыяльна значным — і толькі.

Поўны метр у дакументалістыцы быў прадстаўлены таксама неадназначнай работай Аляксандра Свішчанкова «Мая Германія». Яе герой, жыхар Беларусі, ганарыцца тым, што з'яўляецца этнічным немцам, хоць насамрэч аказваецца звычайным дзедам-мяшчанінам. Рэжысёр аддаў яго развагам і крыўдам столькі месца, што нават незразумела — ці то ён наўмысна даў свайму герою волю, каб той сябе знеслаўляў, ці то ён не справіўся з нацыскам. Карціна атрымалася займальнай, але выпушчанай з-пад кантролю. Як і Нацконкурс у цэлым.

### ІГРАВОЕ КІНО

Бясспрэчна, з шасці карцін вылучаецца нашумелы хіт «Хрусталь» Дар'і Жук, якому, здавалася б, у Беларусі сёння няма канкурэнтаў, бо за ім большы бюджэт, капрадукцыя чатырох краін, фестывальныя лёс і ўзнагароды, адносна добры пракат, рэзананс у СМІ і вылучэнне на саісканне прэміі «Оскар» ад Беларусі.

Дарэчы, нягледзячы на тое, што фільм доўга ішоў у пракаце, не толькі ў Мінску, але і ў іншых гарадах, яго паказы падчас «Лістапада» сабралі поўныя залы. Стужка — толькі нагадваю — вяртае нас у 90-я і расказвае гісторыю дыджэйкі Вэлі, што марыць з'ехаць у Чыкага. З нейкага пункту гледжання «Хрусталь» у конкурсе сапраўды выглядае дзіўна, бо па вытворчай сіле ён нашмат больш прэзентабельны за іншыя карціны.

Таму і было цікава пачуць рашэнне міжнароднага журы, якое ў якасці пераможцы ігравой часткі Нацыянальнага конкурсу выбрала кароткаметражны і не такі прадстаўнічы ў плане маштабу, затое прафесійны, праблемны, узрушальны і стыльны фільм «Дачка» беларускі Мары Тамковіч, што жыве ў Польшчы. Па сюжэце бацька знаходзіць у ваннай дачку, што хацела скончыць жыццё самагубствам з-за цяжарнасці пасля згвалтавання. У спробах дамагчыся справядлівасці бацьку супрацьстаіць літаральна ўвесь свет, таму ў выніку, не знайшоўшы паразумення ў афіцыйнага блока, галоўны герой помсціць гвалтаўніку сваімі сіламі.

Увайшоў у конкурс і альманах «Беларусьфільма» «Вайна. Застацца чалавекам». Гэта другі падобны праект кінастудыі — пасля зборніка «Мы», у якім дэбютавала некалькі маладых аўтараў. Практыку было вырашана працягнуць і гэтым разам закрануць тэму вайны. Меркавалася, напэўна, што маладыя галасы скажуць нешта новае ў традыцыйнай для «Беларусьфільма» сферы. Альманах атрымаўся розным: з пункту гледжання прафесійнай роўнасці вылучаюцца навелы Мітрыя Сямёнава-Алейнікава і Ігара Васільева, трывіяльны сюжэт з сантыментамі пра зоры на небе ўвасобіўся ў кароткаметражцы Зміцера Федаровіча, варыяцыя пра зямныя і незямныя сусветы на фоне Вялікай Айчыннай вайны атрымалася ў Кацярыны Тарасавай. Некаторыя работы тут вызначаюцца словам «дэбют» у найгоршым сэнсе. Затое навела «Франка» Сямёнава-Алейнікава атрымала дыплом «За выдатнае візуальнае рашэнне». Больш работы кінастудыі ў адабраную ігравую праграму не ўвайшлі ні ў якім выглядзе.

### АНІМАЦЫЯ

Самая цёплая, вобразная і прыгожая частка Нацыянальнага конкурсу — гэта анімацыя, прадстаўленая ў тым ліку работамі кінастудыі «Беларусьфільм». Адзіная сфера, у якой ты проста атрымліваеш асалоду ад колераў, вобразаў і нейкай чысціні. Так, ёсць тут пэўны дыктат «жанру», калі работы зроблены ў адукацыйным кірунку для дзяцей, разбіваюцца на часткі, быццам падручнік, завяршаюцца традыцыйнай мараллю. Але візуальныя рашэнні, якімі тут дасягаюцца мэты, і нейкая неамбіцыйнасць топяць ільды Арктыкі.

Найлепшай у анімацыі стала карціна «Лагодны воўк» Наталіі Дарвінай — сюжэцік пра ваўка, што ўвесь час галодны, таму што шкадуе жывёлак і ратуе іх з пастак. Выгнаны са зграі ён засеў у сваім доміку з нарыхтаванымі травамі для заварвання гарбаты і ў нейкім парыве скраў ягня, але і яго не змог з'есці, а толькі акружыў гасціннасцю. У выніку гаспадар ягняці забраў добрага ваўка да сябе, накарміў яго блінамі і назваў замест галоднага лагодным.

Асобны дыплом атрымаў аніматар Ігар Воўчык, ён так і называецца: «Ігару Воўчыку — за вытанчанасць і паэтычнасць яго творчасці». Сёлета ў конкурсе рэжысёр удзельнічаў з фільмам «Ваўчышка» (адны ваўкі гэтым разам), галоўны персанаж якога — уласна ваўчышка — застаўся адзін у страшным лесе, потым трапіў у бяспечны чалавечы дом, але ўсё роўна збег назад.

### ПОСТСКРЫПТУМ

Як па сённяшнім стане, дык Нацыянальнаму конкурсу надзвычай важна вярнуць былы прынцып адбору і даць зразумець, як кінематаграфістам, так і публіцы, што яго праграма фарміруецца дырэкцыяй не толькі ў пачатку, але і на фінальным этапе таксама. Каб важная функцыя гэтай пляцоўкі — а ў беларускай прасторы яна насамрэч выключная — ніколі б больш не нівелявалася.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

| **Извещение о проведении повторного аукциона** | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Калинковичский мясокомбинат», Гомельская обл., г. Калинковичи, ул. Северная, 8 |

**Предмет аукциона**
**Месторасположение**: **Гомельская обл., Калинковичский р-н, Липовский с/с, д. Мироненки, ул. Советская**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| **Здание столовой** | 453,8 кв. м | 333/С-16912 |

**Сведения о земельном участке**: пл. **0,2308 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания столовой

**Начальная цена с НДС 20 % – 208 011,72 бел. руб.**
(снижена на 10 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете **«Звязда» от 30.10.2018**

**Аукцион состоится 05.12.2018 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 04.12.2018 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by

Яўгена Пясецкага

ФОТА СЛОВА

*Я ўжо калісьці жыў*
*І з гэтай рэчкі піў,*
*Сталеў, старэў*
*І нараджаўся зноў.*
*А рэчка ўсё цякла*
*І сцежкаю святла*
*Вяла да невядомых берагоў.*
*Я мару жыць заўжды*
*І не лічыць гады,*
*Не ведаць ні самоты, ні бяды,*
*Каб сцежкай залатой*
*Заўжды ісці з табой...*
*Адно, каб не скавалі плынь ільды.*



Чалавек

# «ЯК БЫЦЦАМ БЫ НЕХТА СВІДРУЕ ЦЯБЕ»



**Аглядальнік Big Think* Філіп Пэры распавёў, як складаныя біялагічныя сістэмы дапамагаюць нам адчуваць на сабе погляд староннягa, што за эвалюцыйныя працэсы ляжаць у аснове гэтай здольнасці і якія кагнітыўныя скажэнні ствараюць у нас ілюзію прысутнасці чужога позірку, нават калі яго няма.**

Уявіце, што вы занятыя чытаннем або «седзіце» ў сваім смартфоне. Нечакана вы адчуваеце, як па спіне бягуць мурашкі. Здаецца, быццам нехта вывучае вас позіркам. Вы абарочваецеся і шукаеце гэтага чалавека. Незалежна ад таго, сябар гэта або вораг, непрыемнае пачуццё ўзнікае на ўзроўні інтуіцыі. Такі стан цалкам натуральны для кожнага з нас: некалі ён дапамагаў нашым продкам пазбягаць небяспекі. Але як у чалавека гэта атрымліваецца? Вельмі проста: за кошт аператыўнага ўзаемадзеяння мозга і зрокавых цэнтраў, а таксама дзякуючы некаторым асаблівасцям нашага віду.

Гэты феномен атрымаў назву «выяўленне позірку». У ходзе нейрадаследаванняў атрымалася высветліць, што клеткі мозга, якія запускаюць працэс распазнавання, дзейнічаюць вельмі дакладна. Калі хтосьці адводзіць ад вас позірк на некалькі сантыметраў налева або направа, непрыемнае пачуццё ў момант знікае. Навукоўцы мяркуюць, што ў аснове работы «ўбудаванага датчыка» ляжыць складаная нейрасетка. Аднак прынцып яе дзеяння да гэтага часу не вызначаны, хоць эксперымент на макаках пацвердзіў сувязь паміж нейроннай сеткай і механізмам выяўлення позірку, нават калі браць пад увагу наяўнасць у малпаў спецыфічных клетак.

Мы дакладна ведаем, што за здольнасць бачыць адказваюць дзесяць абласцей мозга. На самай справе іх можа быць яшчэ больш. Галоўная роля ў гэтым працэсе належыць зрокавай зоне кары, якая размяшчаецца ў задняй частцы галаўнога мозга. Але і іншыя вобласці, напрыклад, міндаліны, могуць быць уключаны ў работу «ўбудаванага датчыка».

Людзі адчуваюць на сабе погляды іншых людзей. Калі хтосьці рэзка змяняе напрамак погляду, мы аўтаматычна на гэта рэагуем. Гэта не проста абазначэнне нашай прыналежнасці да драпежнікаў, якія ад прыроды валодаюць адчувальнасцю і ўменнем прыстасавацца да змен у прыродзе. Гэта хутчэй прыкмета нашай залежнасці адзін ад аднаго, імкнення да сацыялізацыі. Другое адрозненне чалавека ад іншых драпежнікаў — большы памер склеры (вобласці вока вакол зрэнкі). У жывёл асноўную частку вачэй займаюць зрэнкі, што дапамагае засцерагчыся ад драпежнікаў. А вось людзям вялікі памер склеры дазваляе хутка заўважыць змяненне траекторыі позірку суразмоўніка.

Вядома, нам не трэба пільна глядзець на кагосьці, каб вызначыць, куды накіраваны яго позірк. Мы можам ацаніць гэта з дапамогай перыферычнага зроку, аднак такі механізм з'яўляецца значна менш дакладным. Некаторыя даследаванні пацвярджаюць, што мы толькі ўсталёўваем факт наяўнасці або адсутнасці позірку суразмоўніка за кошт кропкі «цэнтральнай фіксацыі». Усё гэта мае дачыненне не толькі да чужога позірку. Перыферычны зрок дазваляе зразумець, у якім становішчы знаходзіцца галава суразмоўніка, якую позу ён выбірае. Наш мозг такім чынам спрабуе зберагчы нас ад памылак.

У 2013 годзе ў часопісе Current Biology быў апублікаваны артыкул пра тое, што «ўбудаваны датчык» з'яўляецца гарантыяй абароны ад збояў. Калі мы адчуваем на сабе нечы погляд, значыць, памылкі быць не можа: хтосьці сапраўды на нас глядзіць. Прафесар псіхалогіі Колін Кліфард з універсітэта Сіднея выявіў, што, хоць людзі не могуць апісаць таго, хто вывучае іх позіркам, яны ў любым выпадку адчуваюць увагу да сябе. «Пільны позірк можа азначаць пагрозу, а калі вы ідэнтыфікуеце нешта як пагрозу, вы не хочаце гэта выпусціць з-пад кантролю. Прызнанне таго, што на вас хтосьці глядзіць, — гэта не што іншае, як ахоўны механізм».

Пільны позірк таксама можа выконваць ролю сацыяльнага сігналу. Калі хтосьці доўга глядзіць на кагосьці, звычайна гэта азначае, што ён хоча загаварыць з ім. Бо мы схільныя адчуваць, што на нас нехта глядзіць, і часам пачуццё, якое мы адчуваем, пачынае выконваць ролю прароцтва, якое само выконваецца. Калі мы азіраемся, наша дзеянне выклікае позірк іншага чалавека. Мы пачынаем глядзець на яго, і нам здаецца, што і ён увесь час на нас глядзеў.

Яшчэ адно тлумачэнне — прадузятасць пацвярджэння: звычайна мы памятаем толькі тыя выпадкі, калі мы павярнуліся, і нехта сапраўды на нас глядзеў. Але здараецца і супрацьлеглае. А як жа непрыемнае пачуццё? Чаму яно ўзнікае? Прычыны тут выключна псіхалагічныя, з самім фізіялагічным працэсам гэта не звязана.

*Вэб-партал са мноствам інтэрв'ю, прэзентацый і круглых сталоў з вядучымі сусветнымі экспертамі ў розных галінах.*

Чулі?

## Робаты будуць ствараць самі сябе



**Заводы па вытворчасці робатаў ёсць у многіх краінах, але лідарам па вытворчасці робататэхнікі паранейшаму застаецца Кітай. Па інфармацыі Reuters, у Кітаі з'явіцца яшчэ адзін робататэхнічны завод, у якім машыны будуць працаваць побач з людзьмі.**

Новы завод будзе пабудаваны швейцарскай кампаніяй ABB, якая вырабляе розную тэхніку, пачынаючы ад электраабсталявання і заканчваючы прамысловымі робатамі. Месцам яго размяшчэння стане ўчастак непадалёк ад кампуса робататэхнікі кампаніі ў Шанхаі, таму што Кітай з'яўляецца другім па важнасці рынкам ABB пасля ЗША. На будаўніцтва ўжо выдзелена 150 мільёнаў долараў.

Завод будзе абсталяваны адмысловым праграмным забеспячэннем, якое дазволіць прамысловым робатам працаваць побач з людзьмі. Для зборкі дробных дэталяў будуць задзейнічаны робаты YuMi, адзін з якіх у 2017 годзе выступіў у ролі дырыжора ў чалавечым сімфанічным аркестры. Робаты будуць выраблягца як для выкарыстання ў Кітаі, так і для імпарту ў краіны Азіі. Па звестках ABB, у 2017 годзе кожны трэці выраблены робат адпраўляўся ў Кітай.

Увогуле краіна набыла 138 000 рабатызаваных механізмаў. Высокі попыт звязаны з падаражэннем працоўнай сілы — многія кампаніі спрабуюць аўтаматызаваць розныя працэсы вытворчасці.

Робаты ўсё часцей і больш выконваюць частку людскіх задач ужо цяпер. У маі 2018 года па вуліцах каліфарнійскага горада Маўнцін В'ю пачалі раз'язджаць робаты-кур'еры кампаніі Starship Technologies. У чэрвені ў кавярнях Cafe X Сан-Францыска з'явіліся робаты для гатавання кавы.

## У Брытаніі пачалі чыпаваць супрацоўнікаў



**Брытанская кампанія BioTeq, якая займаецца распрацоўкамі тэхналогій імплантацыі, вырашыла выкарыстоўваць свае ж прадукты для маркіроўкі сваіх работнікаў. Як паведамляе газета The Guardian, супрацоўнікі кампаніі праходзяць працэдуру імплантацыі ў іх рукі RFID-чыпаў. Пры гэтым паведамляецца, што BioTeq не адзіная кампанія ў краіне, якая пачынае ўкараняць падобную практыку.**

У размове з журналістамі The Guardian заснавальнік BioTeq Стывен Нортэм адзначыў, што такім чынам кампанія зможа павысіць узровень унутранай бяспекі. Супрацоўнікам фінансавага аддзела, а таксама аддзела распрацовак пакуль па жаданні (але, верагодна, у будучыні гэта будзе абавязкова) прапануецца імплантаваць у сваю руку RFID-пазнаку, якая дазволіць праходзіць на тую ці іншую тэрыторыю. Кошт чыпаў і працэдуры імплантацыі можа вар'іравацца ад 70 да 260 брытанскіх фунтаў. Сам Нортэм, а таксама ўвесь савет дырэктараў кампаніі, як і кіраўнікі яе аддзяленняў, сталі першымі, хто прайшоў аперацыю ўжыўлення чыпаў. У інтэрв'ю Нортэм таксама дадаў, што BioTeq пастаўляе такія чыпы ў Іспанію, Францыю, Германію, Японію і Кітай.

Іншая кампанія, шведская Biohax (пра чый вопыт чыпавання «Звязда» паведамляла раней), у хуткім часе пачне прапаноўваць на тэрыторыі Вялікабрытаніі аналагічную паслугу: кампанія збіраецца адкрыць у Лондане офіс. Да цяперашняга моманту паслугамі па імплантацыі чыпаў скарысталіся ўжо больш за 4000 чалавек, у асноўным шведы. Чыпы выкарыстоўваюцца для аплаты праезду ў грамадскім транспарце, а таксама для доступу ў сваё жыллё.

Навіна выклікала вялікі рэзананс з боку праваабарончых арганізацый Вялікабрытаніі, якія кажуць, што імплантацыя мікрачыпаў у арганізмы супрацоўнікаў кампаній дазволіць апошнім яшчэ мацней пранікаць у асабістае жыццё людзей і надзеліць іх новым інструментам сачэння за сваімі супрацоўнікамі. «Мікрачыпаванне дасць кіраўнікам кампаній яшчэ больш улады над сваімі супрацоўнікамі. Тут, бясспрэчна, назіраюцца высокія рызыкі, і работадаўцы не павінны іх ігнараваць ці ціснуць на сваіх супрацоўнікаў, каб тыя праходзілі падобныя працэдуры», — кажуць праваабаронцы.

**Матэрыялы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.**


**Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»**

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»: Республика Беларусь, 220004, г. Минск, просп. Победителей, 29

**КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**
на 1 октября 2018 года

Наименование банка ОАО «Банк БелВЭБ»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | На 01.10.2018 | На 01.01.2018 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 59 642 | 66 731 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 311 | 504 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 514 148 | 413 976 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 173 049 | 243 226 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 717 472 | 575 097 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 2 539 135 | 2 636 457 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | – | – |
| 9 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | – | – |
| 10 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | – | – |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 790 | 821 |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 189 906 | 193 828 |
| 13 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | – | – |
| 14 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 1 219 | 2 696 |
| 15 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 7 | 7 |
| 16 | Деловая репутация | | – | – |
| 17 | Прочие активы | 1113 | 24 568 | 33 365 |
| 18 | ИТОГО активы | 11 | 4 220 247 | 4 166 708 |
| 19 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 20 | Средства Национального банка | 1201 | 21 | 5 009 |
| 21 | Средства банков | 1202 | 1 343 728 | 1 217 570 |
| 22 | Средства клиентов | 1203 | 2 243 983 | 2 351 252 |
| 23 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 16 592 | 4 507 |
| 24 | Производные финансовые обязательства | 1205 | – | – |
| 25 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | 179 | 190 |
| 26 | Прочие обязательства | 1207 | 57 627 | 59 980 |
| 27 | ВСЕГО обязательства | 120 | 3 662 130 | 3 638 508 |
| 28 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 29 | Уставный фонд | 1211 | 117 408 | 117 408 |
| 30 | Эмиссионный доход | 1212 | – | – |
| 31 | Резервный фонд | 1213 | 60 714 | 60 713 |
| 32 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 78 732 | 80 388 |
| 33 | Накопленная прибыль | 1215 | 301 263 | 269 691 |
| 34 | Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации | | 558 117 | 528 200 |
| 35 | Доля неконтролирующих акционеров | | – | – |
| 36 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 558 117 | 528 200 |
| 37 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 4 220 247 | 4 166 708 |

**КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ о прибылях и убытках**
за 9 месяцев 2018 года

Наименование банка ОАО «Банк БелВЭБ»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | За 9 месяцев 2018 года | За 9 месяцев 2017 года |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 208 949 | 270 746 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 94 169 | 132 637 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 114 780 | 138 109 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 72 003 | 66 275 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 25 219 | 21 992 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 46 784 | 44 283 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 78 | 112 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 267 | 938 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 12 361 | 12 683 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (75) | (142) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 17 303 | 43 351 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 8 842 | 9 628 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 104 507 | 105 082 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 6 824 | 7 032 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 54 403 | 50 146 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 11 450 | 8 988 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 42 953 | 41 158 |
| 18 | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | | (100) | – |
| 19 | Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц | | – | – |
| 20 | ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | | 42 853 | 41 158 |
| 21 | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации | | 42 853 | 41 158 |
| 22 | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | | – | – |
| 23 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | |
| 24 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | – | – |
| 25 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | – | – |

Председатель Правления В.С. Матюшевский

Заместитель главного бухгалтера Н.А. Выхота

Дата подписания 08 ноября 2018 года

*Консолидированная бухгалтерская (финансовая) отчетность размещена на сайте www.belveb.by в разделе «О банке / Финансовые показатели деятельности банка / Квартальная финансовая отчетность / Квартальная финансовая отчетность, составленная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь».*

*ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27.12.2013 № 6. УНП 100010078.*





# ЖУРАВІНАВЫ РАЙ

Альманы мяне здзівілі сваёй самабытнай культурай і, вядома, журавінамі. Можна сказаць, што я ўпершыню была на Беларускім Палессі. Раней наведвала толькі Альшаны, што побач. Альманы — гэта зусім іншая атмасфера. Мы крыху спазніліся і прыехалі на фестываль журавін у самы разгар свята. Я хутчэй пабегла глядзець, знаёміцца і частавацца. Разнастайныя падворкі, песні, танцы, дзіцячы смех і смачныя пахі на ўсю ваколіцу — вось, куды я трапіла, як тая Аліса ў краіну цудаў. Але ж сапраўдны цуд у Альманах — гэта не балоты і нават не журавіны — гэта людзі. Тут я пазнаёмілася з Сяргеем Чмуневічам. Ён збірае журавіны разам са сваёй мамай усё жыццё. Кажа, што лепш за журавіны не можа быць нічога, акрамя саміх журавін. На адным з падворкаў дырэктар Мачульскага дома фальклору Ніна Дабрынец прапанавала пакаштаваць смачны фітачай з нагаворным зеллем. Рабіць нагавор я не захацела, але гарбата была найсмачнейшая. Сустрэла Лену Коваль. Яна марыла пазнаёміцца з аўтарамі «Звязды». Калі я прызналася, дзе працую, мы сталі абдымацца. Ехаць назад у Мінск не хацелася. Альманы, да новых сустрэч!

**Таццяна ТКАЧОВА,** *в. Альманы, Брэсцкая вобласць.*









*Скарыстайцеся вашым смартфонам, каб адсканаваць QR-код і ўбачыць больш фота.*

## Информационное сообщение о проведении повторного аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в дер. Глинище, дер. Жажелка и дер. Белая Лужа Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | 20 декабря 2018 года в 10.00 в г. Жодино, пер. Молодежный, 3, Жодинский сельисполком, кабинет № 1 |
| 3 | Продавец и его адрес | Жодинский сельский исполнительный комитет, г. Жодино, пер. Молодежный, 3 |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | **Лот № 1** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881704101000059 в дер. Глинище;<br>**Лот № 2 –** земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881705601000157 в дер. Жажелка;<br>**Лот № 3** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881701601000132 в дер. Белая Лужа |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) |
| 7 | Начальная цена продажи | Лот № 1 – 7 000,00 рублей;<br>Лот № 2 – 7 000,00 рублей;<br>Лот № 3 – 5 000, 00 рублей |
| 8 | Условия проведения аукциона | А) продажа по цене, не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь;<br>В) наличие не менее двух участников;<br>Г) без права предоставления рассрочки |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры | Лот № 1 (в населенном пункте имеется газоснабжение, водоснабжение);<br>Лот № 2 (имеется перспектива газоснабжения);<br>Лот № 3 (на улице имеется водоснабжение) |
| 10 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10 % от начальной цены земельного участка, р/с BY49AKBB36410616005746200000 в ЦБУ № 616 в филиале 612 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Жодино, ул. 50 лет Октября, 25«А», БИК AKBBBY21612, УНП 600023532 (с пометкой «Задаток за земельный аукцион») |
| 11 | Порядок предварительного ознакомления с продаваемыми земельными участками | Каждую среду в 15.00 |
| 12 | Начало подачи заявлений | С 21 ноября 2018 года с 8.00 до 17.00, каб. № 4 |
| 13 | Окончательный срок приема заявлений | 18 декабря 2018 года до 17.00 |
| 14 | Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона | Внесение победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в течение десяти рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся платы за земельный участок и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и внесение платы за земельный участок;<br>осуществление победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона государственной регистрации создания земельного участка и прав на него в Смолевичском бюро Борисовского филиала РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в течение двух месяцев со дня принятия решения о предоставлении земельного участка;<br>получение победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома;<br>занятие (освоение) земельного участка не позднее одного года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и права на него |
| 15 | Контактные телефоны | 8-01775 35-449, 8-01775 37-174, 8-01775 37-189 |

**Расходы по организации и проведению аукциона: Лот № 1 – 1819,93 рубля; Лот № 2 – 1602,12 рубля; Лот № 3 – 1765,53 рубля, затраты на публикацию и размещение информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.**

Примечания: для участия в аукционе на адрес продавца необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Документ (копию), удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица.
4. Доверенность, заверенную нотариально (в случае, если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо).

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Доломит»

**Лот № 1.** Силосный склад цеха № 2, инв. № 200/С-96175, площадь – 1588,2 кв. м, г. п. – 1967. Адрес: Витебская обл., г. Витебск, ул. Центральная, 25/31. **Начальная цена, бел. руб.** – 357 816,00 с НДС. **Задаток, бел. руб.** – 40 000,00. **Шаг аукциона** – 5 %

**Земельный участок:** 240155400001000020, неделимый (письмо Витебского городского исполнительного комитета от 17.10.2018 № 994-01-02-17), долевое пользование. Переход права на долю земельного участка осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

**Условия аукциона:** 1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку должен подписать договор купли-продажи Объекта в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента подписания договора купли-продажи.

3. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 22.12.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Продавец: ОАО «Доломит», 211321, г. Витебск, ул. Центральная, 23, тел. 8 (0212) 69-19-49.

Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, пом. 9, тел. 8 (017) 324-70-57.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Доломит», проводимом 22.12.2018 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 7. Окончание приема заявлений: 20.12.2018 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта: Лифанов Павел Игоревич, тел. 8 (0212) 69-33-66.

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## Извещение о проведении 22 декабря 2018 года торгов с условиями по продаже изолированного помещения, принадлежащего ОАО «Стройтрест № 35»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | |
|---|---|---|---|
| № предмета торгов | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС | Размер задатка, бел. руб. |
| 1 | «помещение физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения» с инвентарным номером 500/D-798190611, общей площадью 84,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Стадионная, 9-260. | 235 200,00 | 23 500,00 |

**Продавец имущества:** ОАО «Стройтрест № 35», ул. Я. Коласа, 38, 220013, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов**: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Стройтрест № 35», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной Дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 30 календарных дней с даты проведения аукциона. Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 рабочих дней с даты поступления денежных средств на расчетный счет продавца в полном объеме.

Расходы, связанные с государственной регистрацией договора купли-продажи и основанного на нем перехода права собственности оплачиваются победителем торгов (покупателем).

Торги проводятся 22 декабря 2018 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 22.11.2018 по 20.12.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону: (029) 611-50-44.

**Телефоны для справок:**

(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (029) 611-50-44 (ОАО «Стройтрест № 35»).

## Извещение о проведении 3 декабря 2018 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | |
|---|---|---|---|
| Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов | Местонахождение | Начальная цена с учетом НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| «административное помещение» общей площадью 2008,7 кв. м с инв. № в ЕГРНИ 500/D-708150242; теплосчетчик SKU-01 с инв. № 462014; электросети 200М К. Либкнехта, 70 с инв. № 01-169; сети водопровода d100 мм L23 м К. Либкнехта, 70 с инв. № 01-170; т/сети К. Либкнехта, 70 с инв. № 01-178 | г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 27 | 1 298 875,36 | 129 000,00 |

**Продавец имущества:** ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220030, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие с организатором торгов соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

